Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. АЎТОРАК № 206 (28316)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хто супраць абмежаванняў алкагольнага продажу?**

СТАР. 4



**Адкуль у дзяцей праблемы з пазваночнікам?**

СТАР. 7



**Няма вяселля без каравая**

СТАР. 8

# ПАД АПЕКАЙ НЯСВІЖСКАГА ЛЬВА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка Нясвіжа Таццяна ВАЛЧОК са сваёй аднагадовай дачкой Палінай каля скульптуры ў гонар культурнай і гістарычнай славы горада.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Важна, каб існуючыя ў краіне рэсурсы, а гэта датычыцца і драўніны, і макулатуры, былі перапрацаваны на нашых прадпрыемствах. Нельга дапускаць, каб каштоўная сыравіна, з якой можна атрымаць розныя вырабы — мэблю, паперу, кардон і іншае, ішла па невялікіх цэнах за мяжу, і потым вярталася да нас у выглядзе тых жа вырабаў, якія мы можам вырабіць самі. Неабходна загрузіць свае магутнасці, забяспечыць людзей работай і атрымліваць больш важкую эканамічную выгаду. Для гэтага ўрадам прыняты шэраг адпаведных мер па абароне інтарэсаў айчынных вытворцаў, забяспечанасці іх сыравінай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9023 | ▼ |
| Еўра | 2,0704 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0305 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Грошы

## КАРТКІ СУПРАЦЬ МАНЕТ

### Дэнамінацыя рубля падштурхнула насельніцтва часцей разлічвацца «пластыкам»

**Рэкордная актыўнасць сярод уладальнікаў банкаўскіх картак была адзначана ў нашай краіне гэтым летам. Тэндэнцыя працягваецца. Усяго за два месяцы сярэдняя колькасць безнаяўных трансакцый на адну картку павялічылася амаль у два разы. Інфармацыю аб гэтым прыводзіць прэс-служба аднаго камерцыйнага банка краіны, спасылаючыся на выпікі аналізу актыўнасці сваіх кліентаў.**

СТАР. 4



■ Выпрабавана на сабе

## НЕ СЫПЦЕ СТОЛЬ НА РАНЫ

### Гісторыя аднаго рамонту

**Нядаўна мне патэлефанавалі суседзі: тэрмінова прыязджай! На трэцім паверсе прарвала трубу з гарачай вадой. Гаспадароў не могуць знайсці. Вада дайшла да першага паверха. Выклікала таксі і праз мінут дваццаць была на месцы. Аднак карціна, якую я ўбачыла, калі адчыніла дзверы ўласнай кватэры, пераўзышла ўсе мае страхі. Уся мэбля ў пакоі плавала, шпалеры адсталі ад сцяны, а вада са столі працягвала ліцца. Першая думка: а дзе ж кот? Ад жаху мой любімец забраўся на секцыю.**

Ну што ж, абы здароўе. А рамонт пацііху зраблю. Тым больш, што пакой невялікі — 17 квадратных метраў. Гэтай справай я займалася неадночы, але цяпер вырашыла даверыцца прафесіяналам. Як толькі падлога і сцены высахлі, пачала шукаць будаўнікоў. Газеты, інтэрнэт стракацяць аб'явамі: зробім рамонт якасна, у тэрмін, нядорага. Спынілася на двух хлопцах. Прыляцелі яны хутка, нібы на крылах. Усё замералі, сказалі, якія матэрыялы купіць. Маўляў, каб не зацягвала, бо заўтра вечарам возьмуцца за справу і ўсё зробяць за два дні. А за работу запрасілі ўсяго каля двух мільёнаў рублёў. Кінулася ў краму, прадаўцы-кансультанты дапамаглі выбраць усё неабходнае. Вечарам тэлефаную па ўжо знаёмым нумары. Званок спачатку скідваюць, а затым наогул мабільнік адключаюць. На наступны дзень паўтараецца тое ж самае. Я ў роспачы. Знаёмая параіла мне жанчыну, якая працуе ў ЖЭСе: «Справілася з рамонтам маёй двухпакаёўкі за тры дні». Новая работніца прыехала таксама хутка. Агледзела жыллё і загнула за работу кошт амаль утрая большы, чым папярэднікі.

СТАР. 6

# НЕ ЎЗВОДЗІЦЬ АГАРОДЖУ, А БУДАВАЦЬ АДНОСІНЫ

## Прэзідэнт Беларусі прапануе падняць планку гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Польшчай

**Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з намеснікам старшыні Савета Міністраў, міністрам развіцця і фінансаў Польшчы Матэвушам Маравецкім, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь і Польшча маюць пэўны ўзровень таваразабароту. «У эканоміцы мы не страцілі, як у палітыцы, кантакты. Тым не менш планку гэтую трэба паднімаць вельмі высока. Таму што, калі мы разлічваем на больш цесныя адносіны з нашай бліжэйшай суседкай, нам, зразумела, трэба стварыць фундамент гэтых адносін. І гэтым фундаментам можа быць толькі эканоміка», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок зацікаўлены ў стварэнні сумесных прадпрыемстваў з Польшчай і гатовы аказаць неабходную падтрымку.

Разам з тым ён звярнуў увагу, што ў эканамічным супрацоўніцтве ёсць і некаторыя засмучальныя факты. «Думаю, што ў ходзе пасяджэння сумеснай камісіі вы зможаце разгледзець іх і намеціць шляхі, як іх нівеліраваць, як зблізіць нашы пазіцыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы ў нечым не маем рацыі, мы хацелі б, каб і Польшча, і ЕС у цэлым прадставілі пэўныя жалезабетонныя факты, супраць якіх цяжка будзе выступіць. Я маю на ўвазе антыдэмпінгавы разбор і гэтак далей».

«Вам як прафесіяналу няма сэнсу тлумачыць розныя пікіроўкі з двух бакоў у сферы мытных працэдур, узаемнага гандлю. У кожнай дзяржавы заўсёды на любыя санкцыі знойдзецца мера ў адказ. Упэўнены, што нам гэта не трэба», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў гэтай сітуацыі церпіць і эканоміка Польшчы, асабліва з прычыны эмбарга з боку Расіі і эканамічных цяжкасцей у суседніх краінах, перш за ўсё ва Украіне. «Таму нам агароджу будаваць з новых нейкіх перашкод у сферы эканомікі не трэба. Мы гатовы да таго, каб нармальна развіваліся нашы адносіны з вельмі блізкай для нас краінай», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Калі гаварыць аб цяперашнім этапе нашага супрацоўніцтва, намецілася пэўная тэндэнцыя да ўстанаўлення больш цесных адносін паміж нашымі краінамі. Думаю, гэта будзе не столькі залежаць ад Беларусі, колькі ад пазіцыі вашай краіны. Вы бачыце наша імкненне наладзіць добрыя адносіны не толькі з усімі суседзямі, але і з Заходняй Еўропай, ЕС у цэлым», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Матэвуш Маравецкі згадзіўся, што гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з'яўляецца добрай базай для развіцця ўзаемадзеяння ў іншых галінах. «Польшча з'яўляецца пагранічнай краінай у ЕС для выхаду на ўсход, а Беларусь з'яўляецца пагранічнай краінай для выхаду краін ЕАЭС на захад. Гэты нюанс мы можам таксама сумесна выкарыстоўваць, у тым ліку ў рамках развіцця Шаўковага шляху», — адзначыў польскі віцэ-прэм'ер.

Ён выказаў гатоўнасць абмеркаваць праблемныя пытанні ў развіцці эканамічнага супрацоўніцтва і знайсці неабходныя рашэнні. «Ужо сёння да сустрэчы з вамі мы гаварылі аб беларускіх трактарах і пастаўках беларускага цэменту ў Польшчу», — сказаў Матэвуш Маравецкі.

«Мы безумоўна хочам, каб супрацоўніцтва давала карысць абодвум бакам. Нам добра вядомы цяжкасці трансфармацыі. Мы самі праз гэта прайшлі. І добра разумеем, які шлях вам неабходна прайсці, і што для гэтага трэба зрабіць», — дадаў ён.

Па выніках студзеня—жніўня 2016 года беларуска-польскі таваразабарот склаў амаль $1,4 млрд (тэмп росту да аналагічнага перыяду мінулага года — 110,6 працэнта). Польшча з'яўляецца трэцім партнёрам Беларусі па таваразабароце пасля Расіі і Украіны, шостым па экспарце і трэцім па імпарце (пасля Расіі і Кітая). Беларускі экспарт у Польшчу склаў $584,4 млн (114 працэнтаў), імпарт з Польшчы — $796,9 млн (108,2 працэнта).

У студзені—чэрвені ў эканоміку Беларусі прыцягнута інвестыцый з Польшчы на суму $109,2 млн ($97,37 млн за аналагічны перыяд 2015-га), у тым ліку прамых $108,25 млн.

У Польшчы дзейнічае 17 прадстаўніцтваў, дачэрніх прадпрыемстваў, суб'ектаў таваразправаднай сеткі і дыстрыб'ютараў беларускіх прадпрыемстваў, у тым ліку канцэрна «Белнафтахім», МАЗа, БелАЗа, МТЗ, Беларускай калійнай кампаніі, Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія», Беларускай чыгункі. У Беларусі дзейнічае звыш 350 прадпрыемстваў з польскім капіталам.

# АБАРАНІЦЬ ПРАВЫ ПРАЦОЎНЫХ

## Размова аб гэтым ішла падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй ФПБ Міхаілам Ордам

**Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, пасля заканчэння сустрэчы Міхаіл Орда растлумачыў журналістам, што ёсць выпадкі, калі наймальнік спрабуе сэканоміць выключна за кошт супрацоўнікаў шляхам скрытага скарачэння або прымусу да звальнення. «Гэта адбываецца шляхам непрадаўжэння кантракта, змянення ўмоў працы», — адзначыў старшыня ФПБ. Паводле яго слоў, Аляксандр Лукашэнка катэгарычна выказаўся супраць вырашэння праблемных пытанняў за кошт звальнення работнікаў. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што абарона правоў працоўных — галоўная задача і аснова сацыяльнай дзяржавы.**

«Мы ўнеслі прапанову, каб павысіць прававую абарону тых, хто працуе па кантракце. Прафсаюзы прапануюць наступны механізм: калі ты адпрацаваў на кантракце год і да цябе няма ніякіх заўваг, з табой павінен быць прадоўжаны кантракт на максімальны тэрмін», — сказаў Міхаіл Орда.

Падчас сустрэчы Прэзідэнт абмеркаваў з Міхаілам Ордам рэалізацыю Генеральнага пагаднення паміж беларускім урадам, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе дамоўленасці ў адпаведнасці з дакументам павінны выконвацца. «Мы прапануем адрэгуляваць гэтыя пытанні ў заканадаўстве, каб узмацніць абавязальніцтва па выкананні ўзятых на сябе абавязкаў», — дадаў кіраўнік федэрацыі.

Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся, як праходзіць мадэрнізацыя структуры ФПБ. На думку Прэзідэнта, работа ў гэтым напрамку павінна праадэўжацца ў адпаведнасці з вопытам вядучых краін. Аптымізуюцца ўсе галіны эканомікі, і прафсаюзы не могуць застыць на месцы і быць у баку ад гэтага працэсу.

Міхаіл Орда таксама праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку аб становішчы Мінскага матавелазавода, стане вытворчасці і сітуацыі ў працоўным калектыве. «Мы выказалі свае прапановы, як гэта вытворчасць павінна далей працаваць і развівацца. Адзін галоўны, неаспрэчны момант — завод ні пры якіх абставінах не можа быць згорнуты», — упэўнены старшыня ФПБ.

# Перапіс насельніцтва пройдзе 4—30 кастрычніка 2019 года

**Адпаведны ўказ Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 кастрычніка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Перапіс будзе праведзены шляхам апытання спецыяльна падрыхтаваным часовым перапісным персаналам. Ва ўказе вызначаны пералік катэгорый грамадзян, якія прыцягваюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады для правядзення перапісу насельніцтва. Пры гэтым прыцягненне часовага перапіснога персаналу плануецца на бязвыплатнай аснове з вызваленнем ад працы ці вучобы на перыяд удзелу ў падрыхтоўцы і правядзенні перапісу насельніцтва з захаваннем месца работы (пасады) і вучобы, сярэдняга заробку (стыпендыі), выплаты пенсіі, дапамогі.

Часовы перапісны персанал таксама атрымае права на добраахвотнае страхаванне ад няшчасных выпадкаў. Дакумент накіраваны на забеспячэнне адзінага для ўсіх дзяржаўных органаў падыходу да арганізацыі і правядзення перапісу, на апаратўнае вырашэнне пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем мерапрыемства, а таксама атрыманне ўсебаковых і аб'ектыўных вынікаў.

# Зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў

**Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў папрасіў польскі бок аказаць садзейнічанне ў правядзенні перагавораў па ўступленні Беларусі ў СГА. Аб гэтым кіраўнік беларускага ўрада заявіў сёння на сустрэчы з намеснікам старшыні Савета Міністраў, міністрам развіцця і фінансаў Польшчы Матэвушам Маравецкім, перадае БЕЛТА.**

«Мы былі б удзячныя польскаму боку, калі б ён з улікам узаемадзеяння з Еўрапейскай камісіяй аказаў бы пэўны ўплыў на тое, каб мы да канца года правялі поўнамаштабныя перагаворы Беларусі з Еўрапейскім саюзам па ўмовах уступлення ў СГА», — сказаў прэм'ер-міністр.

Беларусь пакуль не з'яўляецца членам СГА. «Гэта не таму, што мы неактыўна вядзём перагаворы або ў гэтым плане ў нас нейкія праблемы, проста мы вядзём перагаворы, зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, і не ставім сабе за мэту ўступіць у СГА любой цаной, толькі ўступіць бы», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

На яго думку, цяпер настаў момант, калі ўступленне Беларусі ў СГА з'яўляецца не толькі жаданнем самой рэспублікі, да гэтага імкнуцца і самі краіны — члены СГА. «Цяпер добры перыяд часу, калі можна вельмі аператыўна дамовіцца на прымальных умовах (аб уступленні Беларусі ў СГА. — **Заўвага БЕЛТА**)», — лічыць прэм'ер-міністр.

■ Дыялог бізнесаў

# ТАВАРААБАРОТ ДОЙДЗЕ ДА $4 МІЛЬЯРДАЎ

**Беларуска-польскі эканамічны форум «Добрасуседства-2016» сабраў у Мінску каля 500 прадстаўнікоў бізнесу з дзвюх краін.**

Мерапрыемства ўжо стала традыцыйным і праводзіцца з мэтай развіцця двухбаковага гандлёвага супрацоўніцтва і развіцця кааперацыйных сувязяў у розных сектарах эканомікі. Па словах **старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзіміра УЛАХОВІЧА**, такой вялікай колькасці ўдзельнікаў форум яшчэ не збіраў ніколі. А гэта сведчыць аб рэальнай зацікаўленасці бакоў у актывізацыі супрацоўніцтва, бо Беларусь адыгрывае асаблівую ролю ў Еўразійскім эканамічным саюзе.

«З аднаго боку, мы з'яўляемся ўваходнай прасторай, з другога — прамысловым сэрцам ЕАЭС. У сувязі з гэтым ствараем вельмі добрую платформу для нашых партнёраў з Еўропы для таго, каб адкрываць сумесныя вытворчасці, ствараць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю і прасоўваць яе як на рынак ЕАЭС, так і Еўрасаюза», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч.

**Намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ** падчас форуму адзначыў, што ўзровень таваразабароту Беларусі і Польшчы па выніках бягучага года перавысіць адзнаку ў 2,5 млрд долараў. Але гэта, на яго думку, далёка не мяжа магчымасцяў. «Урады дзвюх краін прапануюць дарожную карту так, што ў найбліжэйшыя 2—3 гады мы выйдзем на таваразабарот у 4 млрд долараў», — падкрэсліў Міхаіл Русы.

У сваю чаргу **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** лічыць, што Беларусі і Польшчы неабходна шукаць новыя ўзаемавыгадныя формы супрацоўніцтва. Вялікія рэзервы ён бачыць у рэгіянальным супрацоўніцтве. Старшыня Савета Рэспублікі таксама падкрэсліў, што ў Беларусі будуць створаны максімальна камфортныя ўмовы для паспяховага ўсебаковага супрацоўніцтва, узаемавыгаднага для бізнесу польскіх кампаній з беларускімі партнёрамі.

«Я задаволены пазітыўнымі тэндэнцыямі развіцця беларуска-польскіх адносін на сучасным этапе. Парламенцкае супрацоўніцтва паміж краінамі дэманструе добрыя перспектывы. Але наперадзе шмат работы, каб парламенцкія сувязі набылі ўстойлівы і сістэмны характар», — выказаў сваё меркаванне Міхаіл Мясніковіч.

Краіны прапрацоўваюць магчымасць стварэння ветрапарку ў пасёлку Зэльва Гродзенскай вобласці. Кошт праекта складае каля 3 млн долараў. Беларусь і Польшча працуюць над магчымасцю рэалізаваць каля 10 сур'ёзных бізнес-праектаў. Таксама, як адзначыў старшыня Польска-беларускай гандлёва-прамысловай палаты Казімеж Здуноўскі, у 2017 годзе плануецца стварыць Беларуска-польскі цэнтр ІРО (публічнага размяшчэння акцый). Пасля двух гадоў работы над праектам бакі прыйшлі да высновы аб неабходнасці падпісання адпаведнага мемарандума.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Класныя навіны

# НЕЗАЛЕЖНЫ ЭКЗАМЕН: УЗВАЖЫЦЬ УСЕ «ЗА» І «СУПРАЦЬ»

**Магчымасць правядзення праз некалькі гадоў нацыянальнага экзамену для выпускнікоў 11-х класаў разглядаюць у Міністэрстве адукацыі. Пра гэта ў праграме «Галоўны эфір» на «Беларусь 1» расказаў міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

У прыватнасці, прапрацоўваецца магчымасць правядзення ў 2019-2020 навучальным годзе незалежнай атэстацыі за 9-ты клас, а ў 2021-2022 навучальным годзе — нацыянальнага экзамену ў 11-м класе. Па словах міністра, пытанні ўдасканалення форм здачы экзаменаў абмяркоўваюцца пастаянна, але абсалютна справядлівай і карэктнай формы пакуль яшчэ не прыдумалі. Ёсць прапановы па ўдасканаленні выпускных іспытаў. Асабліва актуальна гэта стала пасля ўвядзення ў школах профільнага навучання.

Форму нацыянальнага экзамену прапануецца зрабіць камбінаванай, але аснову яго будзе складаць цэнтралізаванае тэсціраванне. Першая частка гэтага іспыту стане праверкай ведаў «за школу», а другая частка будзе абавязковая для тых, хто сабраўся паступаць у сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. У ёй прапануецца акрамя пісьмовых аказаў, увесці і вусныя. Гэтую частку, магчыма, будуць распрацоўваць самі ўніверсітэты ў залежнасці ад спецыфікі спецыяльнасці, на якую прэтэндуе абітурыент. Напрыклад, сёння ўсе заданні ў тэсце па матэматыцы аднолькавыя і для тых, хто здае гэту дысцыпліну на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, і для тых, хто паступае на юрыдычныя спецыяльнасці.

У другую частку нацыянальнага экзамену ўвойдуць розныя формы, розлічаныя на вывучэнне здольнасцяў абітурыента ў залежнасці ад абранай спецыяльнасці, у тым ліку і гутарка.

Па словах міністра, ужо сёння абітурыенты пры паступленні больш чым на 200 спецыяльнасцяў здаюць дадатковыя іспыты ў залежнасці ад спецыфікі ВНУ. Сярод іх — спартыўныя, ваенныя, творчыя спецыяльнасці, а таксама журналістыка.

— Мы пачынаем шырокае абмеркаванне гэтых прапаноў: плануюцца сустрэчы з дэпутатамі, настаўнікамі, выкладчыкамі, бацькоўскай грамадскасцю, — паведаміў міністр.

Што да ўвядзення незалежнай атэстацыі за курс базавай школы, то гэта прапанова выказвалася яшчэ пры абмеркаванні ўнясення паправак у Кодэкс аб адукацыі. Не сакрэт, што ў цяперашніх выпускных экзаменах за курс базавай школы, якія праводзяць «свае» ж настаўнікі, ніхто сэнсу не бачыць, паколькі яны пазбаўлены аб'ектыўнасці. Да незалежнай атэстацыі паступова пераходзяць у многіх краінах. У Расійскай Федэрацыі абавязковая дзяржаўная выніковая атэстацыя дзевяцікласнікаў таксама ажыццяўляецца на незалежнай аснове.

Як варыянт, школьнікам могуць быць прапанаваны стандартызаваныя заданні, якія правяраюцца камп'ютарам, але экзаменацыйная работа абавязкова павінна змяшчаць і заданне творчага характару, якое будзе правяраць незалежным педагогам.

Усе ўпэўнены, што будучыня — за незалежнымі формамі ацэньвання. Але яшчэ ёсць час узважыць усе «за» і «супраць» і падрыхтаваць і дзяцей, і педагогаў да экзаменацыйнага новаўвядзення...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

# ТРЫУМФ БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ

**У Бялградзе ў Сербіі пачала сваю работу 61-я міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Аўтарытэтны кніжны форум Еўропы сабраў гасцей і ўдзельнікаў з дзясяткаў краін свету. Сёлета ганаровым госцем выстаўкі з'яўляецца Іран.**

Вялікім стэндам, шматлікімі мерапрыемствамі прадстаўлена і Рэспубліка Беларусь. Адкрываючы работу беларускага стэнда, міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч расказала гасцям пра тыя дасягненні ў кнігавыданні, якія ажыццёўлены ў нашай краіне.

У Сербіі добра ведаюць і любяць Беларусь. Дзясяткі людзей, знаёмячыся з беларускай кнігай, успамінаюць і гавораць пра палітычную і духоўную падтрымку Сербіі з боку Беларусі, пра візіты нашага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Бялград, пра трывалае беларуска-сербскае сяброўства.

Сведчаннем дружбы нашых народаў з'яўляецца прэзентаваная на стэндзе кніга «Беларусы пра Сербію / Югаславію», выдадзеная ў Мінску ў выдавецтве «Белпрынт». Паўнамоцны і Надзвычайны Пасол Рэспублікі Беларусь у Сербіі Уладзімір Чушаў, расказваючы пра гэта выданне, адзначыў вялікую ролю ў складанні кнігі прафесара БДУ доктара філалагічных навук Івана Чароты. Ён сабраў пад адной вокладкай мноства мастацкіх і публіцыстычных твораў беларускіх аўтараў, пачынаючы з верша Максіма Багдановіча.

У першы дзень работы выстаўкі на нацыянальным стэндзе адбылася прэзентацыя спецвыпуску газеты «Літаратура і мастацтва», прысвечанага беларуска-сербскаму міжлітаратурнаму ўзаемадзеянню. Беларускія ўдзельнікі расказалі пра кнігу «Францыск Скарына на мовах народаў свету», дзе разам з іншымі перакладамі прадстаўлена пераўвасабленне на сербскую мову вядомага тэксту беларускага першадрукара («Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае...»). Аўтарамі гэтых перакладаў з'яўляюцца Радміла Рысціч, Іван Чарота, Саманта Рыц.

Шматлікія сустрэчы беларускай дэлегацыі, кнігавыдаўцоў, распаўсюджвальнікаў друку пройдуць і на іншых пляцоўках Бялграда.

# КНІЖНЫ МОСТ ПАМІЖ БЯЛГРАДАМ І МІНСКАМ

**Міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч сустрэлася з кіраўніцтвам Бялградскага сайма — дырэкцыяй Бялградскай выставачнай кампаніі і заснавальнікамі 61-й Бялградскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Удзел у перагаворах прынялі дырэктар Бялградскага сайма Данка Селіч і гендырэктар Бялградскай кніжнай выстаўкі Зоран Аўрамавіч.**

Гаворка ішла аб больш цесных кантактах беларускіх і сербскіх кнігавыдаўцоў. Не выключана, што ў найбліжэйшыя гады Сербія стане ганаровым госцем Мінскай кніжнай выстаўкі. Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Беларусі ў Сербіі Уладзімір Чушаў таксама браў удзел у сустрэчы. Ён адзначыў важнасць падпісання пагаднення аб больш цесным супрацоўніцтве нашых краін менавіта ў галіне кнігавыдання.

Лілія Ананіч адзначыла, што ў далейшым беларускі бок прасіў бы зарэзерваваць для яго большыя выставачныя пляцоўкі ў Бялградзе. І надалей Беларусь гатова выступаць у Бялградзе на кніжнай выстаўцы Ганаровым госцем. І ў Беларусі чакаюць большага прадстаўлення сербскай кніжкі.

# АДЗІНСТВА ДУХОЎНАЙ ПРАСТОРЫ

**У сербскім парламенце адбылася прэзентацыя кніжкі «Беларусы пра Сербію і Югаславію», якая была складзена прафесарам Іванам Чаротам. Адкрыў мерапрыемства кіраўнік парламенцкага аб'яднання «Дружба з Беларуссю» Драгамір Карыч. Ен пачаў размову з ацэнкі ўкладу Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва ўмацаванне беларуска-сербскіх адносін. «Я рады бачыць развіццё сацыяльна арыентаванай палітыкі Прэзідэнта Беларусі», — адзначыў Д. Карыч. Дарэчы, дэпутацкая група «Дружба з Беларуссю» ў сербскай Скупшчыне налічвае 110 дэпутатаў.**



Затым выступіў намеснік кіраўніка сербскага парламента Уладзімір Марынкавіч. Ён вітаў беларускую дэлегацыю на чале з міністрам Ліліяй Ананіч. Уладзімір Марынкавіч адзначыў, што ў парламента Сербіі добрыя адносіны з Беларуссю ўвогуле, з беларускім пасольствам у Сербіі — у прыватнасці. Таксама ён сказаў, што сербскія палітыкі ўдзячныя за наведванне Сербіі кіраўніком урада Беларусі, міністрам замежных спраў Беларусі, іншымі высокімі дзяржаўнымі асобамі нашай краіны — сапраўднага дружалюбнага партнёра Сербіі.

Паміж парламентамі Беларусі і Сербіі існуюць добрыя адносіны. «Мы, — адзначыў парламентарый, — лічым, што для нашай дружбы, умацавання сувязяў вельмі важныя гуманітарныя, культурныя сувязі». За ўклад у гэта ён выразіў асаблівую падзяку прафесару І. Чароту.

Міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч падзякавала за магчымасць сустрэчы з членамі парламенцкай групы «Дружба з Беларуссю». «Беларусы, Беларусь, — сказала Л. Ананіч, — удзячныя за такія добрыя адносіны Сербіі, сербскага народа да нашай краіны. Беларусь заўсёды ідзе з мірам да іншых народаў, ніколі не ўступае ў канфлікты паміж краінамі і народамі». Л. Ананіч падзякавала парламентарыям Сербіі за словы высокай ацэнкі міралюбівай палітыкі нашага Прэзідэнта. «А. Лукашэнка, выступаючы на пятым Усебеларускім народным сходзе, назваў Беларусь цытадэллю духоўнасці, маральнасці. З гэтым перакананнем мы ідзём у Сербію, выстройваем адносіны з усім светам», — падкрэсліла Лілія Ананіч.

**Кірыл ЛАДУЦЬКА,**
*г. Бялград, Сербія.*

■ Рыхтуемся!

# НАШ АДКАЗ ГРЫПУ

## Усё, што вы хацелі ведаць аб вакцынацыі

**Абарона ад розных інфекцый фарміруецца або пасля перанесенага захворвання, або пасля вакцынацыі. Некаторыя захворванні могуць пераносіцца вельмі цяжка, даваць ускладненні, нават пакідаць наступствы на ўсё жыццё або наогул яго адбіраць. Таму яшчэ раз аб важнасці вакцынацыі нагадалі падчас прамой лініі ў прэс-цэнтры БЕЛТА намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ, намеснік галоўнага ўрача Мінскай гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Святаслаў ВЕЛЬГІН і намеснік галоўнага ўрача 10-й гарадской паліклінікі, галоўны пазаштатны амбулаторна-паліклінічны тэрапеўт камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ірына СВОРАБ.**

Вакцынацыя — гэта эфектыўная і бяспечная трэніроўка імуннай сістэмы. Кампаненты, якія ўваходзяць у склад вакцын, «знаёмяць» імунную сістэму з узбуджальнікам інфекцыйнага захворвання і «рыхтуюць» яе да сустрэчы з ім, забяспечваючы ўтварэнне антыцел, якія будуць нейтралізаваць узбуджальніка, актывізуючы асобныя механізмы абароны.

На працягу апошніх пяці гадоў ахоп насельніцтва вакцынацыяй супраць грыпу перавышае 35–40 працэнтаў, у выніку не адбываецца эпідэмічнага ўздыму захваральнасці на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі. У мінулы сезон, калі ахоп вакцынацыяй перавысіў 41 працэнт, грып перанеслі ўсяго 0,06 працэнта насельніцтва. Між тым складаная сітуацыя назіралася ў іншых краінах, дзе падобныя меры адсутнічалі.

Павышэнне тэмпературы або пачырваненне ў месцы ўвядзення вакцыны — заканамерная рэакцыя на любую вакцыну. Аднак сімптомы гэтыя знікаюць праз 1-2 дні.

У сёлетняй кампаніі вакцынацыі супраць грыпу будуць выкарыстоўвацца вакцыны «Грыпол плюс» (Расія), «Інфлювак» (Нідэрланды), «Ваксігрып» (Францыя), а таксама жывая вакцына «Ультравак» (Расія). Першыя тры прымяняюцца для дзяцей з 6 месяцаў і цяжарных жанчын (у асноўным у другім і трэцім трыместры). Бясплатнае атрыманне прышчэпак у групах высокай рызыкі забяспечваецца з 1998 года вакцынай «Грыпол плюс». У выпадку вакцынацыі за свой кошт ёсць магчымасць выбару вакцыны, сярэдні кошт якой ад Br5 да Br18.



Вакцынацыя супраць грыпу ўваходзіць у Нацыянальны каляндар прышчэпак і з'яўляецца абавязковай (яе абавязаны прапанаваць) для дзяцей ад 6 месяцаў да 3 гадоў, асоб ва ўзросце ад 3 гадоў з хранічнымі захворваннямі і іншых груп насельніцтва, праведзенне прафілактычных прышчэпак якім рэкамендуе Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

Грып, перанесены падчас цяжарнасці, можа прывесці да неспрыяльных наступстваў для здароўя жанчыны і развіцця плода і нават да заўчасных родаў.

Даказана, што вакцынацыя здольная скараціць колькасць звязаных з грыпам шпіталізацый і смяротных выпадкаў сярод цяжарных. Вакцынацыя цяжарных зніжае рызыку з'яўлення і цяжар працякання грыпу ў дзяцей да шасці месяцаў, для якіх не існуе прышчэпак ад грыпу.

У склад вакцын супраць грыпу звычайна ўваходзяць два варыянты віруса грыпу А і адзін-два варыянты віруса грыпу В. Змяненні ў складзе варыянтаў вірусаў адбываюцца практычна штогод. Прышчэпка забяспечвае абарону на 6–12 месяцаў. У ЗША прымяняць прышчэпкі, якія фарміруюць абарону ад двух варыянтаў віруса А і двух — В. Плануецца, што ў нашай краіне ў перспектыве такая вакцына таксама будзе зарэгістравана.

Абсалютным проціпаказаннем да правядзення прышчэпкі супраць грыпу з'яўляецца алергічная рэакцыя на курыны бялок, часовым — вострыя захворванні і абвастрэнне хранічнага захворвання (прышчэпка адкладваецца да наступлення рэмісіі).

Даступныя супрацьвірусныя прэпараты — «Асельтамівір» і «Занамівір» дазваляюць пры раннім пачатку мінімізаваць ускладненні грыпу і папярэдзіць неспрыяльны зыход, у тым ліку гібель. Асабліва гэта актуальна ў дачыненні да тых, хто можа цяжка пераносіць захворванне — людзей з хранічнымі захворваннямі, імунадэфіцытам.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# Вецер з дажджом і мокрым снегам

## А ў сераду слабы галалёд прагназуецца нават удзень

**На гэтым тыдні чакаецца вельмі няўстойлівае надвор'е, што звязана з актыўным цыклонам, які будзе праходзіць уздоўж нашых паўночна-заходніх граніц, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагназаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У аўторак чакаецца ўзмацненне паўднёва-ўсходняга ветру да 15—18 м/с. Раніцай і ўдзень па паўночна-заходняй частцы Беларусі прагназуюцца дажджы, у асобных раёнах — мокры снег. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 1—7 цяпла, а па паўднёвым захадзе краіны — плюс 8—13 градусаў. Прагназуецца, што суцэльныя дажджы будуць назірацца на большай частцы тэрыторыі Беларусі ў сераду. Увага! У гэты дзень ва ўсходняй частцы краіны прагназуюцца моцныя ападкі з мокрым снегам. Будзе слабы галалёд, а парывы ветру ўзмоцняцца да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 1 градуса да 6 цяпла. Удзень па паўднёва-заходняй частцы краіны прагназуецца ад плюс 7 да плюс 9 градусаў.

У чацвер атмасферны ціск пачне павялічвацца і надвор'е ненадоўга супакоіцца. Удзень толькі ў асобных раёнах, а ўначы — па паўднёвым усходзе чакаюцца кароткачасовыя дажджы і мокры снег. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, а ўдзень — 0—7 цяпла.

Потым надвор'е у нас зноў сапсуецца, бо з пятніцы і да канца тыдня на тэрыторыі краіны будзе гаспадарыць цыклон з цэнтрам над Скандынавіяй. Таму ўначы на пятніцу па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі — мокры снег і дождж. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе слабы галалёд. Пахаладае. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — 1—6 цяпла, на захадзе краіны — да плюс 8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, і ў выхадныя на большай частцы тэрыторыі чакаюцца дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Здарэнне

# Трагедыя ў «Палянах»

**У Маладзечанскім раёне на пажары ў дачным доме загінулі бацька і сын.**

Выклік у службу ратавання паступіў а палове на дванаццатую ночы: гарэў дачны дом на тэрыторыі садаводчага таварыства «Паляны». Калі работнікі МНС прыбылі на месца, дах жылля ўжо абрынуўся ўнутр, дом гарэў адкрытым полымем. На падлозе ўнутры ратавальнікі знайшлі загінулага сына гаспадыні 1986 года нараджэння і ўнука 2011 года нараджэння. Агонь знішчыў дом і прыбудаванае да яго гаспадарчае збудаванне, пашкодзіў адзін аўтамабіль. Прычына пажару ўстанаўліваецца. Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, адна з версій — выкарыстанне для ацяплення печы кшталту «буржуйкі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Актуальна

# ГАНДАЛЬ НЕ ЖАДАЕ ЗВЯРГАЦЬ ШКЛЯНОГА БОГА

## Асацыяцыя рознічных сетак — супраць абмежавання продажу спіртных напояў

**З такой адзінай і катэгарычнай пазіцыяй кіраўніцтва асацыяцыі выступіла на прэс-канферэнцыі на пляцоўцы БЕЛТА. Паводле слоў выканаўчага дырэктара гэтай арганізацыі Таццяны ЗАКЖЭЎСКАЙ, неабдуманыя новаўвядзенні ў сферы гандлю могуць адмоўна адлюстравацца на дзейнасці ўсёй галіны і нават прывесці да сур'ёзных эканамічных і сацыяльных наступстваў.**

Размова ідзе аб ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), якое рыхтуе шэраг прапаноў па абмежаванні продажу алкаголю. Сярод іх — забарона рэалізацыі гэтай прадукцыі ў начны час у крамах і кругласутачна — на АЗС. Асацыяцыя рознічных сетак даведалася, што рыхтуецца праект нарматыўнага акта, якім прапануецца яшчэ і абавязаць крамы прадаваць спіртныя напоі, у тым ліку піва, толькі праз спецыялізаваныя аддзелы, а час гандлю алкаголем абмежаваць перыядам з 9.00 да 22.00.

### «Мы — за ідэю, але не ў такім фармаце»

Буйны прыватны гандлёвы бізнес падтрымлівае барацьбу з алкагалізмам, якая сапраўды накіраваная на паляпшэнне здароўя нацыі і ўмацаванне дэмаграфічнай бяспекі краіны, і сам гатоў у ёй удзельнічаць, адразу запэўніў **сустаршыня Асацыяцыі рознічных сетак Сяргей СМОЛЬСКІ**. «Але ў нас выклікаюць сумненні некаторыя прапанаваныя меры па рэгуляванні рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі. На наш погляд, яны не дазволяць дасягнуць пастаўленых высокіх мэт. Больш таго, прапанаваныя абмежаванні могуць істотна паўплываць на зніжэнне тавараабароту арганізацый гандлю», — лічыць спецыяліст.

Прадстаўнікі рэтэйла адзначылі, што калі такія абмежаванні будуць уведзены, то масавы пакупнік пазбавіцца ўжо звыклага камфорту, бо людзі павінны будуць адстаяць адну чаргу, а потым пайсці ў іншы аддзел і патраціць там яшчэ пэўны час.

Гэтыя меры, лічыць Сяргей Смольскі, не закрануць алкаголікаў, бо яны ўжо даўно знайшлі сабе альтэрнатыву ў якасці спіртаўтрымальных лекавых напояў, самагонкі і таннай кантрафактнай гарэлкі, якая паступае да нас з-за мяжы. «Такім чынам, гэта абмяжуе выключна легальны гандаль для нармальных людзей. Таму зараз мы выносім гэтыя пытанні на грамадскае абмеркаванне», — адзначыў прадстаўнік асацыяцыі.

### На чым трымаюцца маленькія магазіны?

«Улічваючы, што алкаголь сёння прысутнічае ў 40% чэкаў пакупнікоў, прапанаваныя абмежаванні істотна паўплываюць на тавараабарот гандлёвых сетак, які за тры кварталы 2016 года і так знізіўся на 3,1%», — падкрэсліў **сустаршыня Асацыяцыі рознічных сетак Андрэй ЗУБКОЎ**. Паводле ацэнак асацыяцыі, у лепшым выпадку тавараабарот можа знізіцца на некалькі працэнтаў, а ў горшым — падзенне здольна дасягнуць 25%. У першую чаргу новаўвядзенні могуць негатыўна адбіцца на рэнтабельнасці невялікіх магазінаў фармату «каля дома», якія і без таго балансуюць па нулявой адзнацы даходнасці.

Спецыялісты асацыяцыі паведамляюць, што магазіны кроквай даступнасці, якія актыўна развіваліся ў апошнія гады, проста па тэхнічных і санітарных нормах не змогуць выканаць патрабаванне аб стварэнні спецыялізаванага аддзела для рэалізацыі алкаголю — для гэтага ім не хопіць плошчы. А без алкаголю, доля якога ў тавараабароце складае каля 20%, рэнтабельнасць гандлёвай кропкі можа стаць адмоўнай. Далей такі магазін трапляе ў разрад банкрутаў і закрываецца.

Цяпер у Асацыяцыю рознічных сетак уваходзіць 18 самастойных арганізацый, на долю якіх прыпадае каля 45% агульнага тавараабароту рознічнага гандлю. Гэта 926 харчовых магазінаў, з якіх 746 працуюць па фармаце «ля дома». Спецыялісты адзначаюць, што прыкладна трацiна з іх можа і не вытрымаць выпрабаванне новымі ўмовамі «гульні».



### Пужаюць павелічэннем цэн

Кіраўнікі прыватнага рэтэйла адзначаюць, што сёння ў краіне для гандлю не самы лепшы час. Адбылося падзенне пакупніцкай здольнасці насельніцтва, шмат грошай гандлем было накіравана на мерапрыемствы, якія звязаны з дэнамінацыяй нацыянальнай валюты. Акрамя таго, рынак «нарадзіў» жорсткую канкурэнцыю гандлёвых сетак паміж сабой. Карпаратыўная барацьба за пакупніка прадугледжвае выкарыстанне мінімальных нацэнак і правядзенне розных акцый са зніжкамі. Сёння пакупнік мае шырокі выбар тавараў і прымальныя для сітуацыі цэны, але...

З прыняццем указа з новаўвядзеннямі па рэалізацыі алкаголю, як мяркуюць прадстаўнікі рэтэйла, яны будуць вымушаны кампенсаваць свае незапланаваныя страты за кошт павелічэння цэн на іншыя тавары. Вось яно як! А сеткі тут будуць невінаватыя? Больш таго, прадстаўнікі асацыяцыі кажуць, што новыя ўмовы гандлю алкаголем могуць прывесці нават да росту інфляцыі ў краіне.

### Праблемы з вяртаннем крэдытаў?

І гэта яшчэ не ўсё. Дырэктарат рознічных сетак упэўнены, што мінімальная рэнтабельнасць гандлёвых арганізацый пасля часу «пік» з новаўвядзеннямі паставіць пад пагрозу іх своечасовую магчымасць разлічвацца па банкаўскіх крэдытах. А маштаб супрацоўніцтва рэтэйла з фінансавымі ўстановамі, у сваю чаргу, можа стварыць дадатковую рызыку для банкаўскага сектара краіны. Цікава, але ў гэтай сітуацыі банкі будуць, напэўна, вымушаны згаджацца з праблемнымі актывамі, бо гандлёвыя кропкі патлумачаць свае цяжкасці змяненнямі правілаў гульні на галоўным полі дзейнасці?

### Кантрафакт плюс ценявы рынак

Любая спроба ўвесці абмежаванні на легальны гандаль алкаголем тут жа выклікае рост продажаў кантрафактнай і падробленай прадукцыі, упэўнены члены асацыяцыі. У свой час забарона гандлю спіртным у прыдарожным магазіне сталіцы «Еўрапейскі» справакавала імгненнае ўзнікненне побач з гэтым аб'ектам стыхійнага рынку па гандлі спіртным, прывяла яркі прыклад **сустаршыня асацыяцыі Наталля ШАБЛІНСКАЯ**. Асаблівая сур'ёзна пытанне нелегальнага гандлю спіртным тычыцца прыгранічных з Расіяй рэгіёнаў, дзе аб'ём афіцыйна рэалізаванага алкаголю ніжэй на 25%, чым у сярэднім па Беларусі.

«Пры гэтым у прапанаваных мерах нічога не гаворыцца пра ўзмацненне барацьбы і адказнасці за тую ж кантрафактную прадукцыю, за спіртазмяшчальныя лекавыя прэпараты і самагонаварэнне. Усе прапановы накіраваны на афіцыйны гандаль, і няма ніводнага, накіраванага на нелегальны абарот алкаголю», — падкрэслілі суразмоўцы. У той жа час рост продажаў кантрафактнай і падробленай прадукцыі не толькі згубна адаб'ецца на здароўі насельніцтва, але і прынясе вялікую шкоду айчынным вытворцам спіртных напояў. Дадатковыя абмежаванні для продажу алкаголю ўнутры краіны, улічваючы няпростыя ўмовы на знешніх рынках, здольныя прывесці да сур'ёзнага пагаршэння становішча індустрыі спіртных напояў.

### Нацыянальная праблема

У свеце ёсць шмат краін, дзе ўмовы гандлю алкаголем яшчэ больш жорсткія, чым тыя, што ў нас зараз толькі плануюцца. І нічога страшнага там не адбылося. Гандаль не загінуў. На гэту рэмарку журналіста Таццяна Закжэўская адказала, што для пераходу на падобны ўзровень культуры піцця нашай краіне спатрэбіцца ад 10 да 20 гадоў. Паводле яе слоў, дзеля гэтага неабходна перавучваць увесь спажывецкі рынак.

**Магазіны кроквай даступнасці проста па тэхнічных і санітарных нормах не змогуць выканаць патрабаванне аб стварэнні спецыялізаванага аддзела для рэалізацыі алкаголю — для гэтага ім не хопіць плошчы.**

У спецыялістаў МУС зусім іншы пункт гледжання на падобную праблему. Паводле інфармацыі праваахоўных органаў, за першыя 6 месяцаў гэтага года ў стане алкагольнага ап'янення здзейснена 165 забойстваў, 273 цяжкія цялесныя пашкоджанні, 37 згвалтаванняў, 516 рабаванняў і 81 разбой, 176 угонаў і 960 хуліганстваў, і гэта ўжо нагадвае нацыянальную праблему...

Не ведаю, якімі павінны быць умовы продажу алкаголю, каб п'яніц стала менш, а звычайным спажыўцам было камфортна набываць тавар. Няхай гэта вырашаюць спецыялісты, але... Буйныя гандлёвыя сеткі вельмі агрэсіўна рэкламуюць алкагольныя напоі. Апошнія займаюць у крамах зручнае ганаровае месца. Піва, гарэлка ці іншы алкагольны напой амаль заўсёды ўдзельнічаюць у розных акцыях са зніжкамі. Часам гарэлка выстаўляецца на самым відным месцы ў краме ў якасці «тавара дня» па мінімальных цэнах. Сам быў сведкам, калі людзі набывалі такую гарэлку не з нейкай нагоды, а па прынцыпе «няхай будзе, бо танна». Любую адкрытую рэкламу тытунёвых вырабаў у нас забаранілі, а пра алкаголь, мабыць, забыліся?

# КАРТКІ СУПРАЦЬ МАНЕТ



### АД КАПЕЕК АДВЫКЛІ

І нічога дзіўнага тут няма, бо людзям немаладога ўзросту разлічвацца за пакупкі папяровымі грашыма новага ўзору, а атрымліваць рэшту капейкамі і манетамі, а таксама «старымі» купюрамі складана. Напрыклад, мае бацькі-пенсіянеры спецыяльна выклікалі мяне да сябе ў раённы цэнтр, каб я іх навучыў карыстацца карткамі ў крамах і інфакіёсках. Мама ўвогуле атрыманую манетамі рэшту адкладала ў спецыяльную шкатулку і ў краму больш не несла. Для яе дрэннага зроку ўся гэта металічная дробязь была «на адзін выгляд», а яшчэ яна баялася манеты згубіць. У выніку маім родным аказалася прасцей разабрацца з мудрагелістацю «пластыка», чым адначасова карыстацца наяўнымі грашыма розных фарматаў.

Беларусы сталі актыўна выкарыстоўваць «пластык» для аплаты невялікіх пакупак, тады як раней задзейнічалі яго ў асноўным пры набыцці дарагіх тавараў. Карткамі сталі часцей плаціць у крамах, кафэ і рэстаранах.

Карткі выцясняюць наяўныя нават у тых галінах, дзе раней прымяняўся пераважна «кэш», у тым ліку пры аплаце праезду або камунальных паслуг. Акрамя таго, хутка расце папулярнасць банкаўскага «пластыка» як сродку аплаты тавараў у інтэрнэце.

### ЗАРАБЛЯЦЬ НА ПАКУПКАХ

Банкіры тлумачаць рэкордную папулярнасць безнаяўных плацяжоў некалькімі фактарамі. Перш за ўсё, нашы жыхары імкнуцца радзей плаціць наяўнымі, каб палегчыць сабе пераход на новыя грошы. Таксама істотным стымулам стала з'яўленне новага пакалення картак з высокім кэшбэкам (функцыя — грошы назад). Напрыклад, уладальнік карткі, якая вяртае да 2% з кожнай пакупкі, плаціць безнаяўным спосабам у 78% выпадкаў, тады як уладальнік звычайнай карткі выкарыстоўвае «пластык» у 38% аперацый. Беларусы таксама сталі часцей выкарыстоўваць мабільны і інтэрнэт-банкінг. Колькасць трансакцый з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА) адчувальна расце кожны месяц, адзначаюць спецыялісты.

### НАЯЎНЫЯ І «ПЛАСТЫК» ЗНІКНУЦЬ ПРАЗ 10 ГАДОЎ?

Сёння наша краіна паступова выходзіць на ўзровень вядучых еўрапейскіх краін па папулярнасці безнаяўных плацяжоў. Лідарам у гэтай галіне выступаюць скандынаўскія краіны, дзе ў большасці выпадкаў расплачваюцца карткамі, а наяўныя выкарыстоўваюць пераважна турысты. Беларусь таксама знаходзіцца на гэтым шляху. У маштабах краіны падобны працэс будзе спрыяць празрыстасці аперацый, тады як звычайна спажывец атрымае больш выгод і пераваг, упэўнены спецыялісты прэс-службы Нацбанка.

**Старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА** яшчэ больш катэгарычны, бо ўпэўнены, што праз 10 гадоў і ў нашай краіне практычна цалкам адмовіцца і ад наяўных грошай, і ад банкаўскіх пластыкавых картак. На яго погляд, «пластык» пратрымаецца да таго часу, пакуль не будзе знойдзены больш просты і бяспечны спосаб ідэнтыфікацыі.

Разам з тым, банкір упэўнены, што для прынцыповага выхаду насельніцтва з сістэмы наяўных неабходна паказваць, што грошы, якія знаходзяцца на картцы, мець больш выгадна і цікава, чым грошы, якія знаходзяцца ў кішэні ці пад падушкай. Рабіць гэта дырэктыўна досыць складана. Неабходна зацікавіць кліента. Беларусы, як усім вядома, вельмі добра ўмеюць лічыць, і любога роду кэшбэк, нейкі працэнт па суме, які застаецца на картцы, іх вельмі радуе. Механізм стымуляцыі павінен быць вельмі пралічаным і падтрымлівацца ўсімі інструментарыямі фінансавага рынку, уключаючы дзяржаўныя інстытуты, банкі і ўрад, упэўнены спецыялісты.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

*kurkach@zviazda.by*

# ПАПАСЦІ НІТКАЙ У ВУШКА ІГОЛКІ

## Як пад Мінскам «Уладароў сяла» выбіралі

**Мінулая пятніца ў Дукораўскім маёнтку, што пад Мінскам, прайшла святочна, з песнямі ды гульнямі. Не бяда, што было хмурнавата ды халаднавата, добрым гаспадарам у любое надвор'е не сорамна запрасіць гасцей у хату. А паглядзець на падворках удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу «Уладар сяла» сапраўды было на што: шэсць маладых сем'яў ужо даказалі, што яны найлепшыя ў сваёй вобласці і ў фінале таксама спаць у шапку не збіраліся. Загадзя развучылі песні і танцы, нагатавалі прысмакаў па адмысловых рэцэптах, апранулі святочныя ўборы. Зрэшты, суддзі конкурсу таксама падрыхтаваліся і прапанавалі канкурсантам запрэгчы каня, нарыхтаваць дроў і выпрабаваць сябе ў «вясковай эстафеце».**

Конкурс «Вітаем па-беларуску» адкрыў нумар Аляксандра і Таццяны Салатаў з Мінскай вобласці. Сямейная пара зрабіла двух галубкоў адметнай рысай свайго выступлення. Пра свой звычайны дзень гаспадары расказалі ў жартаўлівай песні. «Жабу размалявалі, а да столі не дасталі», — чаго толькі не нагледзіцца бацькі, калі ў сям'і падрастаюць гарэзлівыя дачушкі-блізняткі.

Сяргей і Юлія Адамовічы з Віцебскай вобласці расчулілі гледачоў гісторыяй кахання. Рамантычны верш-аповед, прачулы позірк адзін на аднаго — відаць, у гэтых маладзёнаў адно сэрца на дваіх. Шматдзетная сям'я Людмілы і Дзмітрыя Улогаў з Брэсцкай вобласці ўразіла ведамі па гісторыі ўласнага краю. Пра тое, як жывецца на слыннай Альшанскай зямлі, распавялі Насця і Саша Сінькевічы. Бацькам Алегу і Вользе нават не давялося падказваць маленькім артыстам, што яшчэ цікавага трэба расказаць гледачам. Пара Пятра і Кацярыны Чабатар з Магілёўскай вобласці на сцэне з'явілася з калыскай. Маленькая Эльвіра нарадзілася ўсяго два месяцы таму і пакуль дачушка-немаўля адказна спала за ўсю сям'ю, бацькі і старэйшыя сястрычкі спявалі жартаўлівыя прыпеўкі, якім жа будзе іх сямейнае жыццё праз сорак гадоў. Майстрамі на ўсе рукі аказаліся Сяргей і Людміла Свярдловы з Гомельскай вобласці. Дзень конкурсу якраз прыпаў на імяніны Сяргея, таму да гасцей сям'я выйшла «прыбранымі, нібы паны». Праўда адносіны да працы ў пары зусім не панскія: гаспадар сваімі рукамі сабраў для сямейных патрэб трактар, дома можа ўсё адрамантаваць; гаспадыня шые, вяжа, вышывае, пры гэтым паспявае танцаваць і спяваць, захоўваць сямейныя традыцыі.

Вясковы чалавек не толькі добра весяліцца, але і спраўляецца з работай. Першым выпрабаваннем для ўдзельнікаў стаў «Святочны воз». Гаспадар на хуткасць запрагае каня ў вазок, гаспадыня распрагае — быццам бы ўсё лёгка. Але як аказалася, справіцца з усімі рамянямі, хамутом і лейцамі мог толькі абазнаны чалавек. Зацягнеш няправільна вузел, прымацуеш не так аглоблю — і воз распражэцца на першым жа павароце, а інструктар, кіраўнік коннай школы Ірына Захаранка разам з суддзямі залічыць штрафны бал.

— У рабоце з канём галоўнае — цярпенне, — перакананa Ірына. — Удзельнікі малайцы, відаць, што добра падрыхтаваліся. Асабліва ўразілі жанчыны, якія распрагалі каня так жа спрытна, як і мужчыны. Магу сказаць, што ўсе канкурсанты стараліся, штрафных балаў амаль не было.





На пляцоўцы, дзе трэба нарыхтоўваць дровы, свае правілы. Удзельнікі на хуткасць пілілі бервяно на тры роўныя кавалкі, а потым гаспадар павінен быў раскалоць цурбалак на паленцы, а гаспадыня — скласці іх у дрывотню.

Сапраўдныя жарсці чакалі гледачоў на апошнім і самым складаным конкурсе «Вясковая эстафета». Спачатку гаспадары спаборнічалі, хто хутчэй наносіць вады ў бочку. Не кожны дзень убачыш, як мужчыны навыперадкі бягуць да стаўка з вёдрамі на каромысле. Потым за справу браліся гаспадыні. Жанчынам трэба было сабраць гародніну — бульбу, моркву, цыбулю — у асобныя вёдры, пры гэтым нічога не прапусціць і не пераблытаць. А потым пара разам займалася «дробнымі справамі»: жанчыны забівалі цвікі, мужчыны прышывалі гузікі. Рукі ў гаспадароў паспелі замёрзнуць у халоднай вадзе, а тут трэба папасці ніткаю ў вушка іголкі. Не дзіва, што для дужай палавіны гэты конкурс аказаўся такім складаным. Апошні этап — данесці сваю выбранніцу да става на руках і вярнуцца назад, трымаючыся за рукі — падаецца, быў самым прыемным!

Апошнім заданнем для ўдзельнікаў стала стварэнне абярэгаў. Упершыню за гісторыю конкурсу гаспадары прымерылі на сябе ролю старажытнага каваля: у кузні разам з майстрам яны чаканілі манетку для сямейнай скарбонкі.

Потым гаспадар і гаспадыня завіталі да майстра-свечніка. Тут да дзейства далучыліся нават дзеткі: дапамагалі бацькамі качаць свечку з тонкай васковай пласцінкі, а потым шчодра ўпрыгожвалі выраб бліскаўкамі. Залацістае парушынне заставалася не толькі на свечцы, але і на руках, так што ў конкурсантаў на гэтым этапе яны сапраўды былі залатымі.

— Васковая свечка заўсёды была сімвалам чысціні, — дзеліцца гісторыяй прафесіі свечачны майстар Валянціна Марчанка. — Лічылася, што яе святло беражэ хату ад ліха. Самае галоўнае — рабіць гэты абярэг разам, з любоўю і паразуменнем адно да аднаго. Я вельмі рада была бачыць, што бацькам у рабоце дапамагалі дзеткі. Спадзяюся, што любая справа будзе вырашацца ў гэтых сем'ях гэтак жа лёгка.



Пераможцаў павіншаваў Першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вызначыць найлепшага з шасці сямей аказалася для журы складанай задачай. Трэцяе месца заняла пара Алега і Вольгі Сінькевічаў. Другую прыступку ганаровага звання заваявала сям'я Аляксандра і Таццяны Салата. А пераможцамі і сапраўднымі «Уладарамі сяла-2016» сталі Юлія і Сяргей Адамовічы. Акрамя пачэснага звання ўдзельнікаў конкурсу, усе фіналісты атрымалі ганаровыя дыпломы і грашовую прэмію ў памеры 80 базавых велічынь, а таксама каштоўныя падарункі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

*Мінск — Пухавіцкі раён — Мінск.*

---

■ Руплівым гаспадарам

# «СЛОЕНЫ ПІРОГ» ДЛЯ КАВУНА

### Праводзім работу над памылкамі з тымі агароднікамі, якія рашыліся на вырошчванне паласатых ягад

**Паверце, на Беларусі цалкам рэальна займець іх на сваім участку, прычым нават такія, што пацягнуць кілаграмаў на дзесяць. Вось толькі трэба ведаць некаторыя сакрэты.**

— Кавуны прасцей вырошчваць, чым агуркі, — упэўнены **загадчык лабараторыі аграхіміі і харчавання раслін Інстытута агародніцтва Мячаслаў СЦЯПУРА.** — Так, агуркі за сезон трэба збіраць разоў 17, а кавуны адзін-два. Калі расліна атрымлівала добрае харчаванне, яна можа даваць 2-3 плады буйных памераў. Акрамя таго, беларуская прадукцыя атрымліваецца лепшая, чым завазная.



Фота БЕЛТА.

**У аграсядзібе «Багамазаў двор», што ў вёсцы Навасёлкі Петрыкаўскага раёна, кавуны пачалі вырошчваць ужо ў 2011 годзе.**

Адна справа, калі на наш стол трапляе свежая прадукцыя, іншая — калі яе везлі з-за свету. У час падарожжа плады пачынаюць расходаваць цукры на фарміраванне насення. Акрамя таго, каб кавуны не сапсаваліся ў дарозе, іх збіраюць недаспелымі. Не дзіва, што па цукровасці беларускія кавуны могуць нават выйграваць у астраханскіх.

Заўважым, што культура гэта для нашых зямель не такое ўжо дзіва, яе садзілі яшчэ да вайны. А ў 1946 годзе пытанні, звязаныя з вырошчваннем на Беларусі кавуноў і дынь, разглядаліся нават на пленуме ЦК КПБ. Дарэчы, у той час кавуноў у нас збіралі па 45—48 тон з гектара. І гэта пры тым, што ні плёнкі, ні ранніх гібрыдаў тады не было. Але агароднікам трэба ведаць такое правіла: не рэальна атрымаць добры паласаты ўраджай, калі не папрацаваць з глебай.

— У Беларусі дастаткова святла і цяпла для вырошчвання кавуноў. А вось глебы ў нас бедныя. Напрыклад, кавуны ў Расіі, ва Украіне растуць на высакаўрадлівых глебах, на чарназёмах, поймах рэк. Таму «дачныя» людзі, якія гэта не ўлічваюць і не ўносяць угнаенні, не могуць вырасціць кавуны, — тлумачыць вучоны. — У інстытуце мы распрацавалі сістэму харчавання для гэтай культуры (дарэчы, да нас яе ніхто не прадумваў, у паўднёвых краінах, дзе высокая ўрадлівасць глебы, яна непатрэбная). І калі прытрымлівацца тэхналогій, ураджай можна атрымаць нават на бедных глебах. Як чалавеку неабходна збалансаванае харчаванне, так і раслінам.

Пад кавуны трэба ўносіць мікраэлементы, вясной яны будуць комплексныя: азот, фосфар, калій. Паласатыя ягады каштоўныя тым, што ўтрымліваюць шмат магнію. Натуральна, гэтай расліне вельмі неабходны падкормкі такім элементам. Але рыхтаваць глебу пад будучы паласаты ўраджай трэба з восені. Беларускія вучоныя ўзнялі пытанне пра тое, што пад кавуны трэба абавязкова вапнаваць глебу.

— Нідзе не было інфармацыі, што гэта трэба рабіць для вырошчвання кавуноў, — расказвае вучоны, — звычайна так рыхтуюць глебу пад капусту, сталовыя буракі, шматгадовыя травы. Я вырашыў рызыкнуць і рызыка апраўдалася. Дарэчы, калі мы вырошчваем расаду, уносім жа мел, даламітку, чаму гэта не даваць раслінам, якім па 30—40 дзён? У нашай краіне глебы кіслыя, і на такой зямлі карысныя элементы не будуць працаваць. Калі расліна не атрымае патрэбнае сілкаванне, яна не сфарміруе свой «шкілет», не набярэ зялёную масу. Нашы лёгкія глебы мала ўтрымліваюць такіх элементаў, як цынк, жалеза, марганец — іх таксама трэба ўносіць.

Безумоўна, неабходна гэтай расліне і арганіка — перагной ці гной, які напалову разлажыўся. Уносіць трэба 2 разы — восенню і вясной. І не толькі для таго, каб падкарміць расліну, але і каб засцерагчы ад засух. Як правіла, на Беларусі землі з нізкай вільгацяёмістасцю, а пры такім унясенні перагною глеба атрымліваецца як слоены пірог, у якім пасля ападкаў затрымліваецца вада.

Каб атрымаць ураджай, нельга забывацца і на падкормкі, іх можа быць 3-5 за сезон. Так, высадзілі расаду, і, каб даць старт расліне, можна «прапанаваць» каліевую салетру ці нітрат калію. Не забывайцеся на «магній сернакіслы» ці «магній сульфат». Пры пазакаранёвых падкормках Мячаслаў Сцяпура раіць дадаваць такі прэпарат, як «Нанаплант». Дарэчы, ён будзе карысным і пры палівах расліны пад корань.

Другое правіла пры вырошчванні кавуноў — абарона ад шкоднікаў. Чалавек любіць паласатыя ягады, а насякомыя яшчэ больш. І шмат хто гатовы аб'есці салодкія карэньчыкі на расліне — драцянікі, хрушчы, каларадскія жукі, дынная і расткавая мухі... Адзін са спосабаў абароны — абмакнуць камяк з карэньчыкамі ў баўтушку з гліны, каравяку і інсектыцыду. І не забудзьцеся пасля яго крыху падсушыць — атрымаецца своеасаблівая мяжа, якую шкодніку не пераадолець. Таксама можна лінуць раствор з сістэмным прэпаратам (кантактавы не падыдзе, бо расліна яго не ўсмокча і ён не трапіць да дробных карэньчыкаў) на сцяблiну, каб ён пайшоў да каранёвай сістэмы.

— Часам у інтэрнэце агароднікі могуць прачытаць парады накшталт таго, што трэба шукаць для пасадкі месцы, дзе няма драцяніка. А дзе вы знойдзеце такую зямлю? — разважае вучоны. — Гэты шкоднік жыве ўсюды, асабліва там, дзе ёсць злакавыя культуры, газонныя травы. Трэба прытрымлівацца тэхналогій, не абароніце расліну — не здзіўляйцеся, што яна не расце, а можа, і падсыхае, вяне. І не спадзявайцеся, што «праскочыце», шкоднікаў у кавуна вельмі многа і трэба абавязкова ад іх абараняцца.

Кавуны лепш вырошчваць расадай. Ёсць, канешне, і безрассадны спосаб, але ён больш затратны. Пакуль расліна вырасце — шмат пойдзе на абарону яе ад насякомых і пустазелля. Прычым такія расліны трэба абараняць ад птушак, якія могуць падзяўбаць маладыя парасткі. Насамрэч, расліны ім не патрэбныя — яны палююць за лічынкамі, што пад імі хаваюцца.

А яшчэ кавуны не вырастуць, калі не ўгадаеце з сортам. Беларускія вучоныя выпрабоўвалі насенне расійскіх, польскіх, галандскіх кавуноў. Найлепш сябе паказалі галандскія гібрыды, а вось сарты з Расіі ў нашых умовах даюць ураджаі ў 2 разы меншыя. Найлепшымі ж для вырошчвання на Беларусі з'яўляюцца сарты «Раманза», «Топ-ган» і «Аганёк».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*

# Раскрыць вочы на тое, што важна

## Як невідушчых знаёмяць з архітэктурай сталіцы

**Яны спазнаюць свет навобмацак: матэрыял і тэкстура, аб'ём і форма дазваляюць стварыць тактыльны вобраз. Аднак гэта магчыма толькі з невялікімі прадметамі. А як выйсці за рамкі штодзённасці і атрымаць уяўленне аб абліччы свайго горада: вуліцах і плошчах, помніках і архітэктурных збудаваннях? Адказ на гэта пытанне паспрабавала знайсці аўтар праекта «Дакрананне да Мінска» Людміла СКРАДАЛЬ.**



— Я па прафесіі экскурсавод, аднак з людзьмі з асаблівасцямі ў развіцці ніколі раней не працавала. Усё пачалося вельмі спантанна: да мяне звярнулася знаёмая з пытаннем аб тым, куды ў сталіцы можна звадзіць невідушчую маму. Я задумалася і нічога не змагла параіць. У Мінску ўсяго адна турфірма прапаноўвала экскурсіі для людзей са слабым зрокам, але на агульных умовах, папросту кажучы, «паглядзіце налева», «паглядзіце направа». Вядома, гэта зусім непрыдатны фармат.

Так і паўстала ідэя адаптаваць экскурсію пад патрэбы людзей з праблемамі зроку. Як гэта зрабіць? Задзейнічаць іншыя віды пачуццяў, у прыватнасці, дотык. Вывучыўшы вопыт замежных калег, мы прыйшлі да высновы, што аптымальны варыянт — стварыць макеты ключавых збудаванняў горада. Яны з пластыку, лёгкія, мабільныя, у адрозненне ад бронзавых помнікаў значна больш гігіенічныя. Маштаб 1 да 75, але вельмі дакладныя, пры стварэнні выкарыстоўваюцца розныя навобмацак матэрыялы, якія адпавядаюць рэальнаму абліччу будынка: там, дзе вокны — шкло, дзе дах — чарапіца. Акрамя таго, у дадзеным выпадку большае значэнне мае тэкст экскурсіі, правілам яго пабудовы навучаюць на спецыяльных занятках, аповед заўсёды ідзе ад галоўнага да другараднага. Для апісання колеру, напрыклад, выкарыстоўваецца параўнанне: цёплы-халодны.

Я, адразу прызнаюся, супраць масавага збору грошай. Калі людзі хочуць дапамагчы, яны заўсёды знойдуць спосаб як. Для нас было важна атрымаць рэзананс, пачуць розныя меркаванні, парады па дапрацоўцы, новыя ідэі. Для гэтага мы размясцілі праект на краўдсорсінгавай платформе. Нават не чакалі, што водгук будзе настолькі маштабным. Гэты рух паступова ў розных формах пачаў набіраць абарот. Да нас звярнулася велізарная колькасць прадстаўнікоў музеяў і экскурсійных бюро. Я вас запэўніваю, калі хаця б дзясятая частка ўсяго задуманага будзе рэалізаваная, Мінск стане цалкам адаптаваным для культурнага жыцця невідушчых людзей.

Зараз у нас ёсць макет ратушы і рэльефная схема плошчы Незалежнасці. У планах стварэнне паменшанай копіі царкоўнага комплексу «Усіх смуткуючых Радасць» і Вялікага тэатра оперы і балета ў разрэзе, каб можна было адчуць унутранае ўбранне. Паралельна на платформе цяпер запушчаны праект, спосабы рэалізацыі якога мы агульнымі сіламі зараз спрабуем прыдумаць, — «Сны невідушчых».

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

**Што аб гэтай ініцыятыве думаюць людзі, для якіх яна была распрацавана, а таксама ў якіх праектах яны больш за ўсё маюць патрэбу на дадзены момант, мы вырашылі высветліць у мастацкага кіраўніка аддзела рэабілітацыйнай работы прадпрыемства «Святлопрыбор» грамадскага аб'яднання «БелТІЗ», інваліда па зроку першай групы Святланы МАЛІНОК.**

— Магчыма, сказваецца вышэйшая адукацыя ў сферы культуры, але я лічу, што нельга надаваць увагу толькі першасным патрэбам, у тым ліку і людзей з асаблівасцямі. Таму праекты, накіраваныя на духоўны складнік, вельмі важныя. «Дакрананне да Мінска» прадумана сапраўды добра, для невідушчых людзей гэта спосаб далучыцца да нацыянальнай і сусветнай спадчыны. Што, на жаль, я не магу сказаць пра «Тактыльныя карціны» — яшчэ адзін вельмі папулярны зараз у Беларусі праект. Не варта пераацэньваць магчымасці людзей са слабым зрокам: так, іншыя пачуцці абвастраюцца, але не настолькі, каб толькі дзякуючы дакрананням можна было атрымаць поўнае ўяўленне аб выяве. Яно ў большай ступені складаецца з апісання, так што не абавязкова ствараць такія дарагія макеты — можна абысціся якасным тэкстам.

Калі гаварыць пра безбар'ернае асяроддзе, то значна больш хацелася б, каб яно было ў галовах, чым на вуліцах. Большасць людзей пакуль успрымаюць інвалідаў як інтэлектуальна недастатковых, але гэта зусім не так: мы, нягледзячы на асаблівасці, паўнавартасныя: можам быць цікавымі суразмоўцамі, добрымі работнікамі і любячымі бацькамі. У першую чаргу я б развівала праекты, якія аб'ядноўваюць грамадства, пасля чаго значна б палегчылася работа над усімі астатнімі.


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ**
**по продаже земельного участка в частную собственность**

| Наименование объекта | Лот 1 |
|---|---|
| Целевое назначение | Строительство и обслуживание жилого дома |
| Местонахождение объекта | г. Малорита, ул. Ленина, 41 |
| Продавец объекта | Малоритский районный исполнительный комитет |
| Организатор торгов | Малоритский районный исполнительный комитет |
| Начальная цена продажи, руб. | 11024 белорусских рубля 37 копеек |
| Сумма задатка, руб. | 1102 белорусских рубля 44 копейки |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер | 0,1229 га. Кад. № 125250100001003165 Решение Малоритского районного исполнительного комитета от 30.09.2015 г. № 1159 |
| Ограничения в использовании земельного участка | Охранная зона линии связи и радиофикации на площади 0,0002 га Охранная зона сетей и сооружений канализации на площади 0,0002 га |
| Вещное право, срок аренды земельного участка | Частная собственность |
| Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб. | 1478 белорусских рублей 50 копеек |
| Условия продажи | 1. Внесение платы за земельный участок. 2. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка. 3. Осуществление в двухмесячный срок государственной регистрации прав, ограничений прав на земельный участок. 4. Получение в установленном порядке технической (проектной) документации и разрешения на строительство одноквартирного жилого дома. 5. Снятие плодородного слоя почвы из-под строящихся зданий и использование его для благоустройства отводимого участка. 6. Занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на него |

Аукцион состоится **10 ноября 2016 года в 12.00** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1.

**Контактные телефоны в г. Малорита: (8 01651) 2 30 01, 2 30 17, 2 28 03.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка по лоту № 1: на расчетный счет № 3600223000241 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, код платежа 04901, получатель платежа — районный бюджет, УНН 200676206.

3. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего предоставителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который они желают приобрести в частную собственность, предоставляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

В соглашении должно быть предусмотрено условие о задатке, а также конкретный размер штрафа, уплачиваемого:

победителем аукциона в случаях, указанных в пункте 29, абзаце третьем части первой пункта 36 Положения о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462;

единственным гражданином или юридическим лицом, подавшим заявление на участие в аукционе (явившимся на аукцион) и согласившимся с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона;

участниками аукциона, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным в соответствии с частью четвертой пункта 24 Положения о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Кроме того, в комиссию или организацию предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе предоставляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

**– для аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства жилого дома.*

**Заявления об участии в аукционе принимаются до 8 ноября 2016 года (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 82, землеустроительная служба Малоритского райисполкома с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00 по рабочим дням.**


# НЕ СЫПЦЕ СТОЛЬ НА РАНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Затым быў індывідуальны прадпрымальнік Дзмітрый, які параіў: «Столь лепш пакleіць шпалерамі, бо фарбаванне акрылам абыдзецца даражэй». Ударылі па руках. І сапраўды, руплівы работнік да непазнавальнасці змяніў памяшканне. Разлічылася з ім і нават стол накрыла з гэтай нагоды. А праз колькі часу шпалеры пачалі адклейвацца, хоць я выконвала ўсе яго парады: не адчыняла акно, фортку. Зразумела, які ў мяне быў эмацыянальны стан. Не было шкада грошай: справа нажыўная. Было крыўдна, што мяне падманулі як дзіця і што падобнае можа здарыцца не толькі са мной. Дзмітрый нібы ў ваду кануў — тэлефон маўчаў. Пачаліся спрэчкі з мужам, які абвінаваціў мяне ў залішняй даверлівасці да людзей. Таму, маўляў, усё жыццё і пакутуеш ад гэтай рысы характару. Больш за тое, прачытаў цэлую лекцыю: «У савецкія часы сцвярджалі, што ў заходніх краінах моляцца на грошы, а ў нашага чалавека ўсё-такі была духоўнасць і прыстойнасць. Цяпер жа ўсё перавярнулася з ног на галаву. На першы план выходзяць «бабкі», якім спосабам іх зарабіць для большасці не мае значэння. А сорам? Гэта не дым — вочы не выесць».

«Шукаць будаўнікоў і кантраляваць іх работу з гэтага моманту буду сам», — сказаў як адрэзаў.

І ўсё пачалося спачатку. Гэтым разам прыйшлі Іван і Генадзь, якія жывуць у Брэсцкай вобласці, а ў Мінск прыехалі на заробкі. Мужчыны ледзьве не са слязамі на вачах запэўнівалі, што дома не могуць уладкавацца нават вартаўнікамі: няма вакансій. Разам з тым, трэба карміць сям'ю, вучыць дзяцей. Таму ў іх інтарэсах выканаць усе работы якасна, у кароткі тэрмін, і атрымаць разлік. Пасля гэтага яны зніклі. І аб'явіліся толькі праз чатыры дні. Рамонт працягваецца амаль два тыдні. Хлопцы аказаліся не надта ўвішнымі работнікамі. То пакураць, то падсілкуюцца, то грошай папросяць на цыгарэты, пляшку «чарніла»... Перад намі паўстала дылема: выгнаць іх або набрацца сіл і яшчэ крыху пацярпець. Ці варта спадзявацца, што чарговы раз трапіцца ідэальны будаўнік, які ўсё зробіць па мінімальным кошце, якасна, у тэрмін, без падману, якога не трэба ўвесь час штурхаць у плечы. Канешне, такія ёсць, але дзе іх знайсці, каб зноў не памыліцца.



Як сказаў знаёмы, які сутыкнуўся з аналагічнымі праблемамі, падман у будаўнічай сферы не рэдкасць. Каб навучыцца выяўляць нядобрасумленных падрадчыкаў, трэба крыху разбірацца ў нюансах рамонту. Калі чалавек будзе бачыць дасведчанасць заказчыка, то ў яго не ўзнікне жадання падманваць. Акрамя таго, як разумею цяпер, не трэба наймаць брыгады «з вуліцы», якія працуюць за наяўныя грошы. Без дакументаў цяжка зразумець, што павінен выканаць падрадчык і па якой цане. Прыстойныя фірмы або індывідуальныя прадпрымальнікі перш чым брацца за справу, складаюць каштарыс, дзе дакладна ўказваюцца ўсе віды работ, іх цана. У гэтым выпадку, калі не задавальняе якасць рамонту, можна звярнуцца ў суд. І яшчэ, перш, чым брацца за справу, нядрэнна прааналізаваць рынкавы кошт работ і ні ў якім выпадку не плаціць наперад. Гэта дасць хоць невялікую гарантыю кантролю за будаўнікамі.

**Таццяна ГЕОРГІЕВА.**

■ Факт

# ДАВЯЗЁМ СВЕЖАНЬКІМ!

## Кажуць чыгуначнікі пра скарапсавальны груз

**Новую паслугу па дастаўцы грузаў, якія патрабуюць падтрымання тэмпературнага рэжыму, прапануе дзяржаўнае прадпрыемства "Белінтэртранс — транспартна-лагістычны цэнтр" Беларускай чыгункі.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, прадпрыемства ў выпадку неабходнасці можа арганізаваць перавозку розных відаў скорапсавальнай прадукцыі ў экспартных, імпартных, унутрырэспубліканскіх, міжнародных зносінах на любыя адлегласці з падтрыманнем тэмпературнага рэжыму грузаў да -20 °С, а таксама ў тэрмарэжыме на ўсім працягу транспарціроўкі.

Дастаўка скорапсавальных грузаў можа быць арганізавана ў 40-футавых кантэйнерах арганізаванымі рэфрыжэратарнымі счэпамі з падтрыманнем тэмпературнага рэжыму ў краіны Балтыі, Калінінградскую вобласць, іншыя рэгіёны Расійскай Федэрацыі, уключаючы Далёкі Усход, Сярэднюю Азію, Кітай; у адзіночных рэфрыжэратарных кантэйнерах у напрамку Кітая, Манголіі і Далёкаўсходняга рэгіёна Расійскай Федэрацыі, Урала, Сібіры.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Агляд у артапеда

# ВЫПРАСТАЙ СПІНУ!

**ПАГЛЯДЗІЦЕ, як вы седзіце, ходзіце, колькі рухаецеся, і вы зразумееце, адкуль у вашых дзяцей праблемы з апорна-рухальным апаратам.**

Наш апорна-рухальны апарат — косці, суставы і мышцы — могуць пакутаваць ад нараджэння, калі дзіця з'яўляецца на свет ужо з паталогіяй. Другая частка гэтых захворванняў узнікае ў працэсе росту і развіцця, асабліва ў момант гарманальнай перабудовы. Трэцяя група абумоўлена рознымі неадэкватнымі нагрузкамі і траўмамі. Чацвёртая з'яўляецца вынікам перанесеных інфекцый. Урэшце, бывае і так, што імунітэт пачынае працаваць супраць арганізма — развіваецца аўтаімуннае пашкоджанне, калі імунная сістэма ўспрымае родную тканку арганізма як чужую і пачынае з ёй змагацца. Шэраг захворванняў апорна-рухальнага апарату маюць спадчынную прыроду.

У нашай краіне ўзровень такой захваральнасці сярод дзяцей прынцыпова не адрозніваецца ад сусветнага. На 100 тысяч дзіцячага насельніцтва ад нараджэння да 18 гадоў у Беларусі рэгіструецца 3,8-4 тысячы выпадкаў розных захворванняў апорна-рухальнага апарату. Пацыенты з такой паталогіяй знаходзяцца на дыспансерным назіранні ў такіх спецыялістаў, як артапеды, рэўматолагі і неўролагі.

— Артапедычную дэфармацыю пазваночніка маюць 5 працэнтаў людзей у свеце — здаецца, няшмат, аднак ёсць яшчэ парушэнне паставы, якое сфарміравалася ў выніку няправільнай фізічнай культуры і нагрузкі, і тут, паводле сусветных звестак, можна гаварыць пра 48—84 працэнты дарослых людзей з ненармальна сфарміраванай паставай, — тлумачыць **галоўны пазаштатны дзіцячы артапед-траўматолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі наступстваў пашкоджанняў і захворванняў пазваночніка і спіннога мозгу РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Дзмітрый ЦЕСАКОЎ.** — Таму што неабходна сачыць за сваім фізічным станам. Можна быць спартсменам, але фізічна некультурным, а можна быць фізічна культурным і не займацца нейкім агрэсіўным спортам, які таксама здольны нашкодзіць апорна-рухальнай сістэме.

Я прыгадваю, як у першым класе настаўніца сачыла за тым, каб увесь клас сядзеў правільна. А што я бачу ў школе сёння? Настаўніку або не да таго, або калі ён і зробіць заўвагу, то яшчэ невядома, як пасля адрэагуюць бацькі. **Пастава і хада — гэта тое, што бацькі абавязаны заўважаць і кантраляваць!** Між тым, глядзячы на саміх бацькоў, я бачу, адкуль у іх дзяцей праблемы. Калі ж у бацькоў няправільна сфарміраваная пастава, то ў дзяцей фактычна няма шанцаў, бо перад вачамі няма правільнага прыкладу. У выніку да 70 працэнтаў дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў могуць мець ненармальна сфарміраваную паставу! А пазваночнік — орган, які забяспечвае ўсю фізічную актыўнасць чалавека. Няправільная пастава — гэта ненармальная эксплуатацыя, што прыводзіць у сваю чаргу да заўчаснага зношвання. Адсюль раннія астэахандрозы, якія раней былі рэдкасцю ў дзяцей.

Дзецям з выяўленай паталогіяй апорна-рухальнага апарату абавязкова трэба кансультавацца не толькі ў педыятра, але і ў профільнага спецыяліста — артапеда, рэўматолага, неўролага. Для гэтага можна ўзяць ва ўчастковага педыятра накіраванне на кансультацыю да ўрача-спецыяліста. Бывае, што да дзіцячага артапеда адразу не трапіш, але трэба запісацца і пачакаць. Гэта ўсё ж такі вузкі спецыяліст, у нас на ўсю краіну іх каля 115—120 чалавек.

**За апошнія 5 гадоў ніводнае дзіця ці падлетак не былі афіцыйна накіраваныя на лячэнне за межы краіны з прычыны адсутнасці магчымасці аказання неабходнай артапедычнай медыцынскай дапамогі ў Беларусі.** Іншая рэч, што некаторыя бацькі не жадаюць лячыцца так, як рэкамендавана, шукаюць нейкія іншыя варыянты. Адкрываюцца сайты, рахункі, адбываецца шырокая акцыя па зборы грошай. У каментарыях да інфармацыі падобнага кшталту некаторыя людзі цікавяцца, а ці звярталася гэта сям'я ў айчынныя профільныя ўстановы? Адказ звычайна даецца заблытаны і недакладны, маўляў, мы там былі, але ў нас такія праблемы, ускладненні, патрэбна нейкая іншая рэабілітацыя, іншыя лекі, яны нам дакладна дапамогуць. «Гэта не аб'ектыўнае асвятленне сітуацыі, — кажа Дзмітрый Цесакоў. — У нашай краіне можна атрымаць паўнацэнную медыцынскую дапамогу. Аднак пры гэтым трэба разумець, што наступствы захворвання не могуць быць цалкам выдалены. Ні там, ні тут пацыент не прачнецца ў адзін дзень здаровым».



Прыкладна 1,5 тысячы беларускіх дзяцей маюць запаленчыя захворванні суставаў, напрыклад, рэўматоідны артрыт, які пашкоджвае суставы кісцей, ступняў, буйныя суставы, у тым ліку пазваночнік, а можа і наогул прыводзіць да глыбокай інваліднасці, калі пашкоджваюцца і ўнутраныя органы. «Для лячэння гэтай цяжкай паталогіі з 2014 года ў нас прымяняецца высокатэхналагічны метад лячэння — імунабіялагічная тэрапія, выкарыстанне лекаў, якія вырабляюцца метадам геннай інжынеры. Выкарыстанне манакланальных антыцел дазваляе блакіраваць запаленне і выйсці на рэмісію, расказвае **галоўны пазаштатны дзіцячы кардыярэўматолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ірына ЧЫЖЭЎСКАЯ.** — Самыя цяжкія выпадкі сёння кансультуюцца ў Рэспубліканскім цэнтры дзіцячай кардыярэўматалогіі — ён працуе на базе 4-й дзіцячай гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска».

Боль і абмежаванасць руху выклікае і астэаартрыт, які ўзнікае там, дзе сустаў не вытрымлівае ўмоў эксплуатацыі. Некалі выключна дарослае, цяпер захворванне сустракаецца і ў дзяцей. Вялікай праблемай становіцца і плоскаступнёвасць, на якую многія наогул не звяртаюць увагі і пакідаюць без карэкцыі. **Калі ступня — амартызатар пазваночніка — функцыянуе няправільна, значыць, паступова парушаецца функцыя ўсіх суставаў.** Малое спачатку скардзіцца на боль у ступнях, пасля ў падлетка пачынаюць балець калені, а далей у працэс уцягнуцца тазасцегнавыя суставы і пазваночнік ■

■ Месяц анкапрафілактыкі

# З ТЫТУНЁМ ЗМАГАЕМСЯ НЕДАРЭМНА

## Здаровы лад жыцця і рэгулярныя мінімальныя медабследаванні — асноўнае ў ракавым працістаянні

**Ранніх спецыфічных сімптомаў у раку няма. Калі штосьці відавочна дрэннае ўжо ёсць, то гэта можа быць паказчык нават чацвёртай стадыі. Аднак сёння магчыма выявіць анкалагічнае захворванне ў самым пачатку, калі чалавек адчувае сябе абсалютна здаровым.**

З павелічэннем працягласці жыцця будзе расці і анкалагічная захваральнасць, таму што яна цесна звязана са старэннем. «Створаная сістэма работы анкалагічнай службы на раённым, міжраённым, абласным і рэспубліканскім узроўнях скіравана цяпер на палепшэнне ранняй дыягностыкі і прафілактыку, — кажа **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Наталля АНТОНЕНКАВА.** — Дзейнічаюць скрынінгавыя праекты па выяўленні раку малочнай залозы, шыйкі маткі, прастаты і каларэктальнага раку ў абсалютна здаровых. Пазней скрынінг можна будзе распаўсюдзіць на ўсё насельніцтва. Зніжэнню смяротнасці могуць паспрыяць выяўленне і лячэнне перадракавых захворванняў, бо пухліна з'яўляецца не знянацку, што называецца, не на пустым месцы, прадухіленне рэцыдываў анкалагічных захворванняў, метастазаў».

Спецыялісты адзначаюць, што лад жыцця адыгрывае ключавую ролю ў захаванні здароўя. Проста спецыяльнай прафілактыкі для раку няма — яна, па сутнасці, тая ж, што і для здароўя сэрца і сасудаў. Фізічная актыўнасць. Харчаванне з вялікай колькасцю клятчаткі і абмежаваннем жывёльнага тлушчу. І абавязкова — адсутнасць згубных звычак. «У некаторых аддзяленнях нашага цэнтра да 90 працэнтаў пацыентаў — гэта людзі, якія шмат і даўно кураць, злоўжываюць алкаголем, — адзначае **загадчык лабараторыі анкапаталогіі цэнтральнай нервовай сістэмы з групай анкапаталогіі галавы і шыі РНПЦ анкалогіі Аляксандр ЖУКАВЕЦ.** — Адсюль пухліны гартані, слізістай ротавай поласці, лёгкага, стрававода, мачавога пузыра, таму што частка канцэрагенных прадуктаў выводзіцца з мачой...»

Колькасць захворванняў у нас, як і ва ўсім свеце, расце. І гэты рост шмат у чым абумоўлены паляпшэннем дыягностыкі. Некалі людзі паміралі з неўстаноўленай прычыны, а там мог быць і рак. Узяць хоць бы той жа рак прастаты. Развіваецца ён у пажылым узросце вельмі павольна, так што можна дажыць да глыбокай старасці і не здагадвацца аб яго наяўнасці. Аднак практыка праведзення скрынінгу па гэтым відзе анкалогіі прывяла да таго, што колішняя лідары ў структуры анкалагічнай захваральнасці сярод мужчынскага насельніцтва — рак лёгкага, бронхаў, трахеі — саступілі месца раку прастаты. «Значыць, ёсць дакладны вынік палітыкі па барацьбе з тытунём, — заўважае **загадчык аддзела арганізацыі супрацьракавай барацьбы РНПЦ анкалогіі Павел МАІСЕЕЎ.** — Сітуацыя па раку лёгкага ў далейшым можа палепшыцца яшчэ больш, бо ў краінах з больш працяглым вопытам барацьбы з тытунём эфект праявіўся праз трыццаць гадоў. Зніжэння колькасці выпадкаў раку страўніка ўдалося дасягнуць дзякуючы паспяховаму выяўленню і вынішчэнню хелікабактара пілары — прычыны язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Разам з тым у дачыненні да некаторых іншых лакалізацый раку мы бачым рост. Як у выпадку з каларэктальным ракам, што звязана з працэсамператраўлівання ежы, нізкай фізічнай актыўнасцю» ■

### Па аналізе крыві?

Не сакрэт, што ў кожнага чалавека ёсць гены-супрэсары пухлін — яны адказваюць за тое, каб у арганізме не развіваліся анказахворванні. Паломкі, мутацыі ў гэтых генах могуць указваць на схільнасць да развіцця анкалогіі. Але гэта не стапрацэнтная верагоднасць. Проста калі пацыент ведае пра гэта, яму трэба больш дасканала абследавацца і назірацца.

Магчымасць даведацца аб мутацыях прадастаўлена ў Рэспубліканскай малекулярна-генетычнай лабараторыі, што працуе на базе РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Пра ўсю неабходную інфармацыю аб аналізе крыві на спадчынную схільнасць да анказахворвання можна даведацца на сайце цэнтра. Наогул можна высвятліць такую схільнасць па многіх лакалізацыях, але, як правіла, падобнае абследаванне праводзіцца ў дачыненні да раку малочнай залозы, яечнікаў і каларэктальнага раку. Гэтыя тры формы складаюць 90 працэнтаў ад усіх пухлін, звязаных з генетыкай.

У любым выпадку лепш спачатку пракансультавацца, каб ведаць, што шукаць. Бо ў першую чаргу ўрачы рэкамендуюць такі аналіз асобам з пэўнымі фактарамі рызыкі — наяўнасцю такой праблемы ў аднаго ці двух сваякоў першай ступені сваяцтва, у сваяка ва ўзросце да 40 гадоў, шматлікія пухліны ў сваяка.

Павышаны ўзровень маркера можа ўказваць на наяўнасць іншых, неабавязкова анкалагічных, захворванняў. Таму пасля атрымання выніку трэба зноў звярнуцца да спецыяліста, які ведае, што рабіць далей.

■ Псіхалогія

# АД ШЛЮБУ ДА РАЗВОДУ

**Рознабаковую псіхалагічную дапамогу сям'і, якая сутыкаецца з тымі ці іншымі праблемамі, аказвае Мінскі гарадскі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.**

На базе ўстановы працягваецца праект «Бацькоўскі ўніверсітэт» — школы для мам і татаў, а таксама для будучых бацькоў. Практыка паказвае, што сем'і, якія праходзяць падобную падрыхтоўку, больш устойлівыя. Між тым не толькі ў Мінску, але і ў цэлым па краіне назіраецца вялікая колькасць скасаваных шлюбаў — распадаецца больш за палову. Пры гэтым колькасць шлюбаў змяншаецца, а разводаў — прырастае ■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

Ігуменскі тракт
№ 28 (175)



**Пры выпечцы галоўнага вясельнага атрыбута прагрэмуецца дабрабыт маладой сям'і**

ПРАКАВЕТНАЕ



# ЦУД ПАЛЕССЯ — МОТАЛЬСКІ КАРАВАЙ

**На розных фестывалях традыцыйнай культуры нам неаднаразова даводзілася бачыць вясельныя караваі, якія міжволі хацелася называць восьмым цудам свету. Але ж раз за разам мы любаваліся ўжо завершаным «творам» бабуліных рук. І вось нечаканы званок. Дырэктар Мотальскага музея народнай творчасці Вольга Рыгораўна Кульбеда запрасіла нас стаць сведкамі падрыхтоўкі, выпякання і аздаблення сапраўднага вясельнага каравая, які стане галоўным сакральным атрыбутам падчас шлюбу іх аднавяскоўца Паўла.**

Вёску Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці дакладней было б называць мястэчкам: у ёй больш за дзве тысячы двароў, дзве сярэднія школы, некалькі вытворчых цэхаў, каля трыццаці гандлёвых кропак. У цэнтры мястэчка размешчаны даволі моцны этнакультурны «куст»: школа мастацтваў, музей народнай культуры, абрадавы дом і Дом культуры. Людзі, з якімі даводзілася кантактаваць у гэты дзень, падкрэслівалі: «Вось у суседніх Тышкавічах людзі жылі «ад зямлі», а нашы заўсёды былі прадпрымальнікамі». Кажуць, быў час, калі мотальскія «расшытыя» кажухі прадаваліся ў Парыжы, і тамтэйшыя модніцы лічылі за гонар мець у сябе замежнае адзенне.

Менталітэт заможнага гаспадара, усведамленне родавай пайднанасці, выключнае стаўленне да сваіх традыцый — усё гэта самым непасрэдным чынам было спраецыравана і на працэс тварэння вясельнага каравая.

У тым сакральным працэсе, які ўцягваў у таямніцы народнага светапогляду, было два цэнтры тварэння: хата бабулі жаніха Ніны Мікалаеўны Кульбеды і хата стрыечнай бабулі Вольгі Якаўлеўны Дзямковіч.

Абрадавая дзея пачалася а восьмай гадзіне раніцы. Зразумела, што ролю старшай каравайніцы выконвала сама гаспадыня, а побач з ёю стаялі нявестка і дачка хросная маці жаніха. Пры гэтым Ніна Мікалаеўна ўдакладніла, што да прыгатавання каравая і яго аздаблення допускаліся толькі замужнія — тыя, хто «быў у пары».

У хаце на покуці побач з абразом Мікалая Цудатворца паставілі стол, які заслалі спецыяльным абрусам, а на лаве каля сцяны стаялі ўсе рэчы, якія былі неабходны для прыгатавання рошчыны. На стол паставілі вялікую міску, аднак перш чым распачаць складаны і працяглы працэс прыгатавання свяшчэннага хлеба, старшая каравайніца прачытала малітву Збавіцелю, прамовіла магічную формулу-заклічку: «Дай, Божа, у добры час пачаць, а ў лепшы закончыць!» Пасля гэтага яна наліла ў чарачку свянцонай вады, якая захоўвалася ў хаце з Вадохрышча, і выліла ў міску. Затым у тую ж чарку наліла гарэлкі і таксама выплеснула ў міску. Мы пастаянна прасілі гаспадыню ўслых каментаваць тое, што рабілася вакол стала. Наконт кілішка гарэлкі яна сказала: «Каб маладыя здаровыя і вясёлыя былі». Затым туды ж вылілі літраў шэсць-сем цёплага малака, дабавілі два пачкі дражджэй, а праз некалькі хвілін маладзейшыя каравайніцы пакрысе пачалі сыпаць пшанічную муку. Спрытныя рукі каравайніц замешвалі цеста-рошчыну.

Затым цеста пакінулі «адпачываць», а калі прыйшоў час фарміраваць каравай, паміж каравайніцамі разгарнулася цэлая дыскусія адносна таго, як правільна падзяліць прыгатаванае цеста. Аказалася, што ў гэты момант вырашалася кола пытанняў, якое закранала розныя этапы вясельнай дзеі.



Зразумела, што асноўную долю рошчыны пакідалі для каравая. А далей пачыналася складаная вясельная матэматыка, памыліцца ў якой было недапушчальна.

У спецыяльную форму палажылі цеста для «сустрэчнага каравая» — хлеба-солі, якім бацькі будуць сустракаць маладых пасля рэгістрацыі або вянчання ў храме. У дзве асобныя формачкі паклалі цеста для «падручнікаў» — дзвюх прадаўгаватых булак, якія бацькі будуць трымаць пад пахаю на працягу ўсяго абраду вянчання. Яшчэ з адной часткі рошчыны зрабілі кругляш у дыяметры каля пятнаццаці сантыметраў, які будзе знаходзіцца на прыгатаваным караваі і сімвалізаваць месяцовую поўню — фактычна будучую нявестку ў стане цяжарнасці. А далей паўставала яшчэ больш складаная сістэма дэкаратыўнага аздаблення, дзе дамінавалі сакральныя лікі тры і дзевяць.

На караваі жаніха (пазней мы пераканаемся, што адпаведная сімволіка прысутнічала і на караваі нявесты) жаночы пачатак увасабляла фігурка, якая нагадвала лацінскую літару «S», толькі ніжняя і верхняя частка былі закручаны больш, як у скрыпічным ключы. Фігурка, якая ўвасабляла мужчынскі пачатак, была больш складанай па форме: спачатку адзін канец раскатанага цеста (крыху таўсцейшы за аловак) складвалі ўдвая, затым другую частку «шнура» спіралепадобнай формай накручвалі на здвоеную частку рошчыны. А затым вырабляліся тры фігуркі, якія павінны былі сімвалізаваць перапляценне мужчынскага і жаночага пачаткаў: у гэтым выпадку крыжападобна адна на адну накладваліся дзве «літары» «S». У выніку атрымлівалася нешта падобнае на знак-свастыку, які з даўніх часоў сімвалізаваў сонца. Такім чынам, на вясельным караваі аказалася дзевяць сімвалічных фігурак. Увесь гэты карагод сімвалаў замыкала ў непарушнае кола «каса», якая абрамоўвала ўсю паверхню рытуальнага хлеба.



Калі прыгатаванне каравая было завершана, аказалася, што невялікая частка рошчыны засталася, тады бабуля пачала ляпіць фігуркі птушак. Рабіла яна гэта настолькі спрытна, што мы нават не паспявалі сачыць за яе рукамі. Мы зноў папрасілі яе паказаць гэта ў запаволеным рытме, каб зафіксаваць. Ніна Мікалаеўна патлумачыла: цеста з вясельнага каравая не павінна заставацца (!), таму і рабілі з яго добры дзясятак птушак, якія затым раздадуць пакаштаваць і каравайніцам, і гасцям на вяселлі.

Прыгатаваны каравай накрылі спецыяльным ручніком і панеслі ў хату бабулі Вольгі.

Там ужо знаходзіўся і каравай нявесты. Перш чым ставіць караваі ў печ, жанчыны спяшаліся выпечы яшчэ адно дзіва з сістэмы ўпрыгожвання мотальскага вясельнага каравая — «шышачкі». Тут зноў пачыналася складаная сакральная матэматыка, якая прадвызначала філасофію збліжэння і паяднання двух родаў — жаніха і нявесты. У некаторых сем'ях іх рыхтавалі загадзя, яшчэ летам, у некаторых — напярэдадні самога вяселля. З пладовых дрэў — груш, вішань, сліў — выразаліся галінкі памерам каля 70—80 сантыметраў у адпаведнасці з сакральнай матэматыкай мясцовай традыцыі. З аднаго боку, трэба было нарыхтаваць, напрыклад, для каравая жаніха, тры галінкі-«двайчаткі», гэта значыць такія, якія разыходзіліся на дзве галіны, а з другога — адну галінку-«трайчатку», якая ўтварала трайное разгалінаванне. Каравай нявесты ўпрыгожвалі дзве «двайчаткі» і дзве «трайчаткі». З гэтых галінак была акуратна зрэзана кара, а затым іх з месца разгалінавання і да самага верху абгортвалі (зноў-такі па спіралі) палоскай





смачнага цеста. Затым кожную «шышку» паасобку засоўвалі ў печ і трымалі, пакуль цеста не спячэцца. Выпечаныя «шышкі» ставілі на стол пад абразамі.

Пасля таго як завяршылася выпяканне «шышак», у печ паставілі абодва караваі.

Прыкладна а сёмай гадзіне вечара ў хаце бабулі Ніны пачалася заключная частка аздаблення каравая. Вакол стала сабраліся некалькі жанчын сярэдняга ўзросту, якія павінны былі завяршыць упрыгожванне «шышак», а напрыканцы даафарміць і кампазіцыю самога каравая.

Працавалі па парах. Адна жанчына трымала «шышку», а другая брала добры дзясятак сцяблін аўса з зернем і ніткамі мацавала да выпечаных рагалікаў. Адначасова з сцяблінамі аўса мацавалі на кожную галіну па пяць папяровых рознакаляровых кветак.

Пакуль жанчыны завіхаліся вакол «шышак», бабуля Ніна разам са сваёй нявесткай рыхтавалі чырвоны жгут, якім будуць мацаваць «шышкі» на караваі. Бабуля стала ў калідоры, а нявестка ўзяла клубок чырвоных нітак, папрасіла адну з дзяўчынак трымаць адзін канец ніткі, а сама пачала снаваць туды-сюды, можа, разоў з дваццаць, затым яны ўдзвюх пачалі скручваць тонкія ніткі ў адзін ладны жгут. Як толькі завяршылі снаванне, чатыры жанчыны ўзялі кожная па адной «шышцы» і размясцілі іх над караваем так, каб утварыць замкнёны чатырохвугольнік. Па камандзе старшай каравайніцы жанчыны адначасова ўваткнулі «шышкі» ў каравай, бабуля пачала абкручваць іх тым тоўстым нітом — знізу ўверх.

Як толькі «шышкі» звязалі, каравайніцы з палёгкай уздыхнулі, перахрысціліся і адступілі ад стала. Некалькі імгненняў усе стаялі, быццам заваражаныя той прыгажосцю, якая толькі што нарадзілася. Да каравая хутка падышла матуля жаніха і спрытна аперазала каравай ручніком. Затым паклікалі жанатага брата жаніха, які будзе на вяселлі сватам. Той паклаў пад каравай грошы, затым прыняў яго на спецыяльны ручнік, тройчы вакол сябе перакруціўся і панёс каравай у клець. Перад тым як паставіць яго на іншы стол, ён зноў тройчы перакруціўся. Усё, тут цуд жаночых рук будзе захоўвацца да наступнага дня, да моманту, калі прыйдзе час яго вынесці і падзяліць паміж усімі гасцямі вяселля.

Не хацелася развітвацца з удзельнікамі каравайнага абраду, ведаючы, што заўтра адбудзецца вяселле, а ў нядзелю па вёсцы паедуць «цыганы». І няважна, што ў іх картэжы не будзе коней, і вясковыя артысты пасядуць у прычэп сучаснага мотаблока. Галоўнае, што традыцыя жыве.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

■ У глыб стагоддзяў

# КУЛІ, БРАНЗАЛЕТЫ, АБРАЗКІ ДЫ МАНЕТЫ

## Горад на шляху «з варагаў у грэкі» сёлета раскопвалі валанцёры з усяго свету

**Гісторыя гэтага краю цесна звязана з Дняпром, які злучае паўночныя моры з Чарнаморскім басейнам, Скандынавію з землямі колішняй Візантыі. Маленькі райцэнтр Лоеў — усяго за 55 кіламетраў ад Гомеля. Гарадскі пасёлак стаіць на высокім правым беразе Дняпра, у месцы, дзе з ім злучаецца Сож. З берага адкрываецца маляўнічы від на заліўныя лугі ў лукавіне рэк. Непасрэдна ў горадзе па рацэ праходзіць дзяржаўная мяжа з Украінай. Палова рэчышча — беларуская, другая — украінская. Геаграфічнае становішча Лоева з даўніх часоў вызначыла яго гістарычны шлях. Зручнае месцазнаходжанне імкнуліся выкарыстоўваць і тыя, хто тут жыў, і тыя, хто квапіўся на гэтыя землі.**



Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ганна ЦІМАФЕЕНКА.

З каменнага веку насельніцтва абжыло высокі бераг, выгадны камунікацыйны вузел. Але калі менавіта на Лоевай Гары ўзнікла гарадское паселішча — гэта пытанне застаецца адкрытым, хоць афіцыйная дата ўпамінання Лоева ў летапісе — 1505 год, калі населены пункт быў спалены крымскімі татарамі. У сувязі з гэтымі падзеямі яму і «пашанцавала» трапіць у пісьмовыя крыніцы.

Знішчэнне гарадка адбывалася некалькі разоў на працягу XVI—XVII стст., але ён настойліва і ўпарта адраджаўся. Амаль пяць стагоддзяў Лоеўшчына ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага. З канца XV стагоддзя Маскоўская дзяржава вяла шматгадовыя войны з Вялікім Княствам за валоданне памежнымі тэрыторыямі. Лоеўскія землі былі арэнай пастаянных сутыкненняў. На гэтым фоне знамянальна тое, што Лоеў 3 жніўня 1576 года атрымаў магдэбургскае права. Такая падзея сведчыць, што ён здабыў статус значнага цэнтра вытворчасці і грашова-таварнага абмену.

31 ліпеня 1649 года каля Лоева адбылася буйная бітва часоў казацка-сялянскай вайны 1648—1651 гадоў паміж войскамі польнага гетмана літоўскага Януша Радзівіла і казацкай арміяй Сцяпана Падбайлы і Міхаіла Крычэўскага. Падчас двухдзённай бітвы пад Лоевам загінула больш за 12 тысяч ваяроў. У 1651 годзе пад Лоевам адбылася другая бітва дзяржаўнага войска з казакамі. Абедзве бітвы скончыліся разгромам казацкіх войскаў.

На працягу 150 гадоў барацьбы за ўладу і тэрыторыі землі ў вусці Сожа пастаянна спусташаліся. Пра гэта сведчаць шматлікія знаходкі свінцовых куль, жалезных ядраў, спаленыя рэшткі селішчаў... Гэтым летам у Лоеве каля рэшткаў печы ў пабудове XVII—XVIII стст. быў знойдзены «клад» свінцовых куль. Гісторыкі сцвярджаюць, што тады загінуў кожны трэці жыхар беларускай часткі Вялікага Княства.

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 25 октября по 28 ноября 2016 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.20 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

**Контактный телефон 41-97-86.**

**Информация размещена на сайте:**
**www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 08 ноября 2016 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 20% после предыдущих несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости — зданий, сооружений, передаточных устройств и оборудования, расположенных по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельхлебпром» на праве собственности**

| Лот №1 | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Наименование объекта** | **Адрес объекта** | **Краткая характеристика объекта** | **Начальная цена, бел. руб.** (в т.ч. НДС 20%) | **Задаток, бел. руб.** (в т.ч.НДС 20%) |
| Трансформаторная подстанция, **инв. №330/С-21152** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74 | Назначение: сооружение специализированное энергетики. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 40,7 м.кв. | **1 402 755,84** *(Справочно: начальная цена без учета деноминации 14 027 558 400 бел. рублей)* | **10 000,00** *(Справочно: сумма задатка без учета деноминации 100 000 000 бел.рублей)* |
| ***Земельный участок** на праве постоянного пользования площадью **0,0063 га** с кадастровым номером 323550100006000767. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |
| Мазутонасосная, **инв. №330/С-11451** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/2 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 100,4 м.кв. | | |
| Помещение для соли, **инв. №330/С-11450** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/1 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 74,6 м.кв. **Здание сдано в аренду сроком по 14.01.2017 г.** | | |
| Здание склада инвентаря и оборудования, **инв. №330/С-11449** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/6 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1985 г. постройки. Общая площадь 196,5 м.кв. *Составные части и принадлежности: тамбур* | | |
| Сухарный цех с пристройкой и подсобным корпусом, **инв. №330/С-11453** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/3 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1954 г. постройки. Общая площадь 925,1 м.кв. *Составные части и принадлежности: тамбур, пристройка к сухарному цеху, подсобный корпус, рампа с навесом, площадка с крыльцом, крыльцо, отмостка.* | | |
| Здание главного производственного корпуса, **инв. №330/С-11447** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Трехэтажное строение, 1955 г. постройки. Общая площадь 2171,2 м.кв. **Части здания общей площадью 328,77 сданы в аренду максимальным сроком по 12.05.2017 г.** | | |
| Сооружения | Ворота выездные, две дымовые трубы, ворота на весовую, ворота аварийного выезда, ограждение, ограждение металлическое, площадка с ограждением для песка, бетонная площадка, благоустройство территории (асфальтированное покрытие) | | | |
| Передаточные устройства | Сети канализационные, инв.№ 330/С-22386; наружные сети канализационные, инв.№ 330/С-22383; наружные сети водопроводные, инв.№ 330/С-22384; внеплощадочные сети вдопроводные, инв.№ 330/С-22385; сеть наружного освещения, слаботочная электрическая сеть, низковольтная электрическая сеть | | | |
| ***Земельный участок** на праве постоянного пользования площадью **1,2982 га** с кадастровым номером 341500000006000008. На указанном земельном участке **расположено сооружение специализированное гражданской обороны с инв.№ 330/-20619**, общей площадью **164,9 м.кв.,** находящееся в собственности Республики Беларусь. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |
| Оборудование | Силос для склада БХМ – 12 единиц, котлоагрегат Е-1/9 – 3 единицы, деаэрационный бак, деаэрационная колонна, весы автоматические. Электрические щиты и приборы: трансформатор ТМ400 – 2 единицы, ячейка КСО366 – 2 единицы, регулятор реактивной мощности, теплосчетчик | | | |
| Шаг аукциона – 5%. Цель использования Объектов – за исключением производства хлебобулочных и кондитерских изделий | | | | |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9-00 до 12-00 и с 13-00 до 16-00 **по 04 ноября 2016 г**. включительно. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09-00 до 10-00 **08 ноября 2016 г.** Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5%.

**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) — паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г.Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 25 октября 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 0,5% от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 14.09.2016 г. №177.*

**Организатор:**
**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76**
**• www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец:**
**ОАО «Гомельхлебпром», г. Гомель, ул. Интернациональная, 8. ☎ 8 (0232) 21-50-33; 21-50-34**

■ Спорт-тайм

# НАШЫ Б'ЮЦЬ РЭКОРДЫ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра выступленне хакейных «зуброў» у чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі, гандбольнага БГК у Лізе чэмпіёнаў і разам радуемся рэкордам беларускіх плыўцоў.**

***1. Хакеісты мінскага «Дынама» атрымалі буйную перамогу над сапернікамі з «Сочы» — 5:2.*** Хет-трыкам у сустрэчы адзначыўся Роб Клінкхамер. Пасля гэтай вікторыі мінскія дынамаўцы перамясціліся на шостае месца ў турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі. На іх рахунку 40 ачкоў пасля 22 гульняў. Чарговы матч у КХЛ мінскае «Дынама» правядзе 27 кастрычніка ў гасцях супраць яраслаўскага «Лакаматыва».



***2. На этапе Кубка свету па плаванні ў 25-метровым басейне, які завяршыўся ў Сінгапуры, лідар нашай мужчынскай зборнай Павел Санковіч абнавіў нацыянальны рэкорд на дыстанцыі 50 м на спіне — 23,01 секунды.*** Такі час дазволіў Паўлу заняць першае месца.

Ранейшы рэкорд Беларусі на 50 м на спіне таксама належаў Паўлу Санковічу (25,05 сек.) і быў усталяваны ў пачатку кастрычніка ў Досе.

Лідар жаночай зборнай Аляксандра Герасіменя ў Сінгапуры ўдала выступіла на дыстанцыі 50 м вольным стылем, заваяваўшы бронзавую ўзнагароду (24,40 сек.).

Наступны этап пройдзе 25-26 кастрычніка ў Токіа.

**3. Адбыліся ўсе матчы 26-га тура чэмпіянату краіны ў вышэйшай лізе.** У Мінску «Крумкачы» спынілі серыю няўдач, абгуляўшы «Граніт» — 2:1. «Віцебск» на сваім полі адолеў «Нафтан» з Наваполацка — 2:0, а футбалісты «Іслачы» з мінімальнай перавагай перайгралі «Тарпеда»-БелАЗ — 3:2. Гродзенскі «Нёман» у хатняй сустрэчы перайграў «Гарадзею» — 3:0. У нядзелю ў сталічным дэрбі «Мінск» і «Дынама» згулялі ўнічыю — 0:0, а «Шахцёр» абыграў «Белшыну» і ўмацаваў свае пазіцыі на другім месцы — 1:0. Яшчэ два матчы завяршыліся без забітых мячоў — БАТЭ — «Славія» — 0:0 і «Дынама-Брэст» — «Слуцк» — 0:0.

***4. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў выязным матчы Лігі чэмпіёнаў прайграў венгерскаму «Піку» — 22:24.***

Гандбалісты «Піка» з першых хвілін захапілі ініцыятыву, на перапынак каманды пайшлі з мінімальнай розніцай у ліку — 11:10 на карысць венгерскай дружыны. У другой палове матча БГК так і не ўдалося пераламіць ход сустрэчы.

— *Улічваючы, што гулялі трэці матч на выездзе, было няпроста. Тым не менш я задаволены, што каманда змагалася, гуляла на перамогу. Зараз паўза. Ёсць тры тыдні для падрыхтоўкі да наступных гульняў. Самыя асноўныя з іх наперадзе. Калі правядзём іх паспяхова, то задача на сезон будзе вырашана на 80%,* — адзначыў пасля гульні **галоўны трэнер брэсцкага клуба Сяргей БЯБЕШКА.**

Такім чынам, у групе В, дзе выступае беларускі клуб, па-ранейшаму лідзіруюць «Віве» і «Вардар», якія набралі па 8 ачкоў. У гандбалістаў «Райн Лявена» — 7 балаў, «Піка» — 5, БГК — 4. Па тры ачкі зарабілі «Крысціянстад» і «Цэле». Замыкае табліцу з двума баламі «Заграб».



# УЗЯЦЬ ЯШЧЭ АДНУ ВЫШЫНЮ

## У Мінску завяршылася 45-я Генеральная асамблея Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў

**На ёй быў прыняты шэраг важных рашэнняў, якія ў будучыні адаб'юцца на развіцці спорту на кантыненце.**



Літаральна за некалькі дзён работы ў беларускай сталіцы дэлегаты з 50 краін Еўропы паспелі абмеркаваць самыя важныя пытанні сусветнага спорту. У ходзе работы Генасамблеі ўдзельнікі заслухалі даклад аб фінансавай дзейнасці ЕАК, зацвердзілі бюджэт на 2017 год і расказалі аб ходзе падрыхтоўкі да Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестываляў у венгерскім Д'еры і турэцкім Эрзуруме. Акрамя таго, былі разгледжаны пытанні ўзаемадзеяння алімпійскіх камітэтаў з Еўрапейскім саюзам, які актыўна падтрымлівае шматлікія пачынанні ЕАК у развіцці дзіцяча-юнацкага спорту, выключаючы гранты на розныя праекты.

У дні работы Генасамблеі ў Мінску паспелі вызначыць гарады, у якіх адбудуцца зімовы і летні Еўрапейскія юнацкія алімпійскія фестывалі ў 2021 годзе. Зімовы турнір прыме фінскі Вуакаці, а летнія спаборніцтвы пройдуць у славацкім Кошыцы. Таксама былі названыя шэсць лаўрэатаў прэміі ЕАК за найбольш значны ўклад у развіццё спорту ў сваіх краінах. Такога гонару ўдастоіліся трэнеры і спартыўныя кіраўнікі з Украіны, Славакіі, Кіпра, Грузіі, Італіі і Літвы. Акрамя таго, ва ўрачыстай абстаноўцы была ўручана прэмія Пятра Нуроўскага лепшаму маладому спартсмену Еўропы, ім стаў Эмануіл Караліс з Грэцыі (скачкі з шастом).

Але самае важнае рашэнне, прынятае на Генасамблеі для нашай краіны, — гэта прадастаўленае права на правядзенне другіх Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе.

**Першы віцэ-прэзідэнт НАК Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ** адзначыў, што ўжо на наступны дзень адбылося пасяджэнне рабочай групы па правядзенні Еўрагульняў-2019.

— *Намі ўжо сфарміраваны групы, якія будуць вырашаць пэўныя задачы па падрыхтоўцы да важных стартаў. Абмеркавалі, якая дапамога неабходная з боку Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў. Дыскутавалі і над спартыўнай часткай, якія віды спорту будуць прадстаўлены на Еўрапейскіх гульнях. Адразу адзначу, што Беларусь будзе абапірацца на тую спартыўную базу, якая ўжо ёсць у краіне, каб мінімізаваць выдаткі на правядзенне гэтага маштабнага мерапрыемства,* — расказаў Максім Уладзіміравіч.

Адзначым, што ў праграму Еўрапейскіх гульняў-2019 можа ўвайсці 12—15 відаў спорту, у тым ліку і тыя, што не прадстаўлены на Алімпіядзе.

— *Нам паабяцалі і ўжо прадставілі падтрымку ў выглядзе кампаній, якія ў партнёрстве з намі будуць ажыццяўляць маркетынгавую падтрымку. У плюс мы, вядома, не выйдзем, але тыя фінансавыя выдаткі, якія панясём, усё роўна застануцца ў краіне. Акрамя таго, частку выдаткаў, напрыклад, па пералёце, на сябе гатовыя ўзяць еўрапейскія алімпійскія камітэты. Гэта значыць, мы таксама вызваляемся ад гэтай ношы, якая пры гэтым застаецца ў авіяперавозчыка.*

Максім Рыжанкоў таксама падкрэсліў, што пад Алімпійскую вёску дазволілі выкарыстоўваць Студэнцкі гарадок.

Увогуле, падводзячы вынікі 45-й Генасамблеі, першы віцэ-прэзідэнт НАК адзначыў, што ўсе дэлегаты засталіся задаволеныя работай у Мінску.

— *Госці ад'язджаюць з разуменнем таго, наколькі ўзровень беларускага боку адпавядае еўрапейскім стандартам, яны ўбачылі нашы магчымасці па арганізацыі турніраў, стаўленне кіраўніцтва краіны да спорту і, думаю, не засталіся расчараванымі.*

*Чарговая, 46-я Генасамблея Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, пройдзе ў 2017 годзе ў Харватыі.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ
ZVAROT@ZVIAZDA.BY

■ Чалавек — чалавеку

# «БЫЎ, ПРАЦАВАЎ... А ЯК ДАКАЗАЦЬ?»

**Больш за 35 гадоў я пастаянна выпісваю газету «Звязда». Усё мне ў ёй падабаецца, чытаю навіны, законы, ведаю, як іншыя людзі жывуць. Да таго ж, некалі газета мне вельмі дапамагла. З яе старонак даведаўся, што створаны фонд «Узаемадапамога і прымірэнне», што тым, хто знаходзіўся ў месцах прымусовага ўтрымання, выплачваецца кампенсацыя. Я тады аформіў дакументы, знайшоў патрэбных сведак і праз пэўны час атрымаў дапамогу...**

Пасля гэтага я хацеў атрымаць і статус вязня, звяртаўся ў многія інстанцыі, але ж пакуль безвынікова. На апошні мой зварот у Дзяржкамітэт па архівах і справаводстве прыйшоў адказ, што работа па пошуку звестак, якія я запытваў, была праведзена, аднак спісаў асоб, што ў гады вайны прымусова ўтрымліваліся ў лагеры ў вёсцы Дашкоўка Магілёўскага раёна, у архівах, на вялікі жаль, не маецца.

Коратка напішу, як я туды трапіў.

Нарадзіўся і жыў я ў вёсцы Красны Асавец, аж пакуль туды не прыйшлі немцы. Добра памятаю, як яны выгналі нас з хаты, як самі пасяліліся там і сталі карыстацца ўсім дабром, якое нажывалі мае бацькі. А мы ў гэты час перабіваліся ў зямлянцы, у лесе. Аднак і там было небяспечна, бо немцы досыць часта рабілі аблавы і ўсіх, каго злавілі, адпраўлялі ў Германію.

Каб пазбегнуць гэтага, мы сталі жыць у вёсцы Ляжанка, але і туды на конях, з сабакамі аднойчы прыскакаў атрад карнікаў, стаў зганяць людзей. Тых, хто не мог ісці, расстрэльвалі і пакідалі на месцы, тых, хто мог, — гналі ў бок вёскі Красніца. На той час яна была ўжо спалена разам з людзьмі.

Мы думалі, што нас таксама заганяць у нейкі хлеў ды спаляць. Але ж немцы казалі, што адправяць у Германію. Гналі туды праз Красніцу, Кузькавічы, Вароніна. Потым у вёсцы Мокрае сталі «сартаваць», каб некага потым і сапраўды адправіць у Нямеччыну, а некага пакінуць тут, у рэзерве, прымусіўшы працаваць. У выніку я, 13—14-гадовы падлетак, застаўся даглядаць коней, пілаваць і секчы дровы. А потым, прадчуваючы адступленне, немцы ўзяліся акопвацца, ставіць абаронныя збудаванні. На гэтыя вельмі цяжкія работы зганялі людзей з многіх навакольных вёсак. Хапіла тады і мне...

Але ж цяпер даказаць, што я непаўналетнім хлапчуком быў у лагеры ў вёсцы Дашкоўка і цяжка працаваў, ніяк не атрымліваецца. У раёне, у камісіі па прызначэнні пенсій кажуць, што трэба прывесці чатырох сведак, якія былі ў лагеры разам са мной і маюць адпаведныя дакументы. А дзе іх шукаць? Магчыма, хоць нечым дапаможа «Звязда»?

**Леанід Ерафеевіч Малашкоў,**
*в. Красны Асавец, Быхаўскі раён.*

**Ад рэдакцыі.** *Ці трэба казаць, што дапамагчы (а тым больш інваліду I групы і падпісчыку з гэткім стажам) газеце вельмі хацелася б, але як, калі ўсе інстанцыі, як піша Леанід Ерафеевіч, пройдзены?*

*Тады надзея, магчыма, адна: на чытачоў, бо можа стацца, што нехта з іх таксама быў у названым лагеры, мае патрэбныя дакументы і не проста ўспомніць падлетка па імені Лёня, але і захоча яму дапамагчы?*

*Адрас Леаніда Ерафеевіча знаходзіцца ў рэдакцыі.*

■ Кватэрнае пытанне

# З ЧАРГІ МОГУЦЬ ЗНЯЦЬ, А МОГУЦЬ ПАКІНУЦЬ

**Мая дачка — малады спецыяліст. На першым месцы працы ёй далі інтэрнат, паставілі на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў. Зараз яна збіраецца замуж. Жаніх — мінчанін і ў кватэры, якую арандуюць яго бацькі, ёсць свабодны пакой. Калі дачка пераедзе туды, ці знімуць яе з чаргі на жыллё?**

**Л. Баравік,**
*Бабруйскі раён*

У адпаведнасці з падп. 32.1 п. 32 Палажэння аб уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і аб парадку прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.12.2013 № 563) «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін», далей — Палажэнне № 563, грамадзяне здымаюцца з так званай кватэрнай чаргі ў выпадку, калі адпалі падставы для прызнання іх маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

У дадзеным выпадку вырашэнне гэтага пытання залежыць ад шэрагу абставін. Напрыклад, калі ў кватэры, куды збіраецца пераехаць дачка, забяспечанасць агульнай плошчай перавысіць устаноўлены нарматыў для прызнання грамадзян маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (менш за 15 кв. м (у г. Мінску — менш за 10 кв. м) на аднаго чалавека) — гэта будзе з'яўляцца падставай для зняцця з кватэрнага ўліку. Калі ж жылое памяшканне дадзена наймальніку на ўмовах дагавора найму жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду, які складзены на тэрмін працоўных (службовых) адносін, то ў адпаведнасці з падп. 3.1.6 п. 3 Палажэння № 563 тыя, хто пражываюць у такім жылым памяшканні, прызнаюцца маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, што будзе з'яўляцца падставай для захавання кватэрнага ўліку за маладым спецыялістам па месцы працы.

**Віктар САВІЦКІ**

■ Што бачу

# УСЁ ЯК ВА ЎСІХ?

Будны дзень. Ранішні тралейбус. Абрывак размовы.

— А дачка твая як? — пытае адна жанчына ў другой.

— Ды дзякуй богу... Ужо дыплом пачынае пісаць.

— А потым, пасля вучобы, некуды размяркуюць?

— Не... Мы ж яе на платным вучылі. Так што першую працу самім давялося шукаць. Фірмачку адну ў сталіцы знайшлі. Абяцалі ўзяць.

— А з жытлом што?

— Ды таксама пашчасціла: непадалёк ад Мінска домік ім купілі.

— Чаму ім? Яна што — ужо замужам?

— Ну, не сказаць, каб так... Як усе цяпер — жыве з адным хлопцам.

...Маці, карацей, задаволена, бо, што ні кажы, а ўладкаванае дзіця: без пяці хвілін з вышэйшай адукацыяй, з працай, з уласным жыллём і нават з мужам, як быццам!

Усё як ва ўсіх. Ці ў многіх.

**Наталля КАЛІНОЎСКАЯ,**
*г. Віцебск.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# РЫМСКІЯ «КАНІКУЛЫ»

## Чаму Італію называюць «галоўным хворым» Старога Свету?



**Колькасць італьянцаў, якія жывуць за рысай беднасці, летась дасягнула максімуму з 2005 года, паведаміла міжнародная дабрачынная арганізацыя Caritas. Паводле яе звестак, немаёмных у Італіі ў 2015-м налічвалася больш чым 4,5 мільёна — амаль 8% насельніцтва краіны. Пры гэтым рымска-каталіцкая царква канстатуе: сярэдні ўзрост беднякоў знізіўся да 44 гадоў. Дабрачынныя арганізацыі звязваюць гэтую тэндэнцыю з ростам беспрацоўя сярод моладзі. Таксама адзначаецца, што ўпершыню колькасць бедных італьянцаў, якія звярнуліся ў дабрачынныя цэнтры царквы на поўдні краіны, перавысіла колькасць беднякоў, хто не з'яўляецца яе грамадзянамі. Як удакладняе царква, у паўднёвых рэгіёнах Італіі дзве трэці немаёмных — італьянцы. На поўначы краіны, наадварот, па дапамогу часцей звяртаюцца мігранты. Гэтыя «сімптомы» яскрава адлюстроўваюць агульны стан трэцяй эканомікі Старога Свету. Як адчувае сябе цяпер Італія?**

### Дай €200 млрд!

На думку шэрагу экспертаў, Еўропа можа сутыкнуцца з новай праблемай, куды больш маштабнай за Brexit. Справакаваць чарговы рэгіянальны фінансавы крызіс могуць італьянскія банкі. Нягледзячы на тое што Італія з'яўляецца трэцяй эканомікай ЕС, мясцовыя банкі назапасілі нямала «дрэнных» даўгоў (сума пазык, вяртанне якіх пад пытаннем, цяпер перавышае €360 млрд). Развіццё тармозяць скарачэнні ў прамысловым сектары, беспрацоўе і слабы ўнутраны попыт.



Урад Італіі скарэктаваў прагноз эканамічнага росту на 2016 і 2017 гады. Прэм'ер-міністр краіны Матэа Рэнцы заявіў, што рост эканомікі Італіі сёлета складзе толькі 0,8%, а налета — 1%. У другім квартале яе развіццё нечакана спынілася, нягледзячы на прагноз невялікага, але ўсё-ткі росту — 0,2%. Не дзіўна, што галоўны італьянскі банк — Bank of Italy — і МВФ дружна панізілі прагноз развіцця італьянскай эканомікі на гэты год. Цярпенне Рыма, падобна, скончылася. Ва ўрадзе Рэнцы лічаць, што без паслаблення палітыкі жорсткай эканоміі, якой Італія прытрымлівалася пад ціскам Брусселя і Берліна, або поўнай адмовы ад яе, зрушыць з месца італьянскую эканоміку і нешта змяніць у лепшы бок немагчыма. Таму Матэа Рэнцы пачаў перамовы з Еўракамісіяй аб чарговай адтэрміноўцы ў зніжэнні дэфіцыту бюджэту ніжэй устаноўленых 3% ад ВУП.

Чорны спіс самых вялікіх страт узначальваюць італьянскія банкі. Усіх турбуюць іх велізарныя «дрэнныя» даўгі. Варта адзначыць, што капіталізацыя італьянскага банка Banca Monte dei Paschi di Siena, які паказаў горшыя вынікі паводле стрэс-тэстаў ва ўсёй Еўропе, сёлета звалілася на 80%. Не дапамаглі нават планы па барацьбе з «таксічнымі» актывамі і павелічэнне капіталу. А Unione di Banche Italiane, чыя капіталізацыя скарацілася на 62%, у жніўні паведаміў аб больш высокай страце, чым чакалася, з-за «дрэнных» даўгоў і выдаткаў на рэструктурызацыю.

Еўрапейскі саюз крытыкуе італьянскі бюджэт, незадаволены ён і тэмпамі росту эканомікі краіны. Пры гэтым знешні доўг Італіі з'яўляецца другім па велічыні ў еўразоне пасля Грэцыі, а ў 2016 годзе павялічыўся да 132,8% ВУП краіны. Зрэшты, такія праблемы характэрныя і для ўсяго Старога Свету ў цэлым.

Відавочна, што Італіі тэрмінова неабходны рост. Па звестках нядаўняга даследавання, праведзенага Deutsche Bank, яна з'яўляецца адзінай збяднелай краінай зоны еўра з 1999 года, паводле аб'ёму эканамічнай вытворчасці на душу насельніцтва. Нават Грэцыя і Партугалія пасля заснавання зоны еўра могуць пахваліцца невялікім прыростам. Прычым, сцвярджаюць эксперты, існуе вельмі мала шанцаў на рэзкі паварот у італьянскай эканоміцы.

У пачатку 2012 года яна знаходзілася ў лепшым стане ў параўнанні з суседняй Іспаніяй. Бясконцыя перастаноўкі ва ўрадзе пасля сыходу палітычнага доўгажыхара Сільвія Берлусконі, а таксама негатоўнасць новых уладаў да эканамічных пераўтварэнняў прывялі краіну да фактычнага краху эканомікі, сцвярджаюць апытаныя Bloomberg эканамісты. «Узровень знешняга доўгу Італіі склаў у 2015 годзе рэкордныя €2 трлн 169 млрд, што амаль на €300 млрд больш аб'ёму ВУП краіны (€1 трлн 850 млн). Праблемы ў банкаўскай сферы, слабы рост ВУП, а таксама адсутнасць мер па лібералізацыі рынку працы цягнуць эканоміку дзяржавы на дно», — упэўнены галоўны эканаміст чыкагскай бізнесшколы Booth Луіджы Зінгалес.

**Мэр Рыма Вірджынія Раджы адкрыта заявіла, што адмоўны вынік рэферэндуму «пахавае ўрад».**

Паводле апошніх звестак Еўрастата (статыстычнай службы ЕС), тэмпы росту ВУП Італіі на працягу пяці гадоў вагаліся на ўзроўні 0,3%-0,5%, у той час як узровень беспрацоўя дэманстраваў устойлівы рост — з 8% у 2012 годзе да 12,6% летась. Урад амбіцыйнага Матэа Рэнцы не справіўся і з рэформай банкаўскага сектара. Сёлета аб'ём суверэннага фонду Atlas складае толькі €5 млрд, але, па ацэнцы кабінета італьянскага прэм'ера, для выратавання эканомікі краіны неабходна яшчэ €45 млрд, якія ўлады маюць намер атрымаць ад Еўрасаюза. Аднак еўрапейскія чыноўнікі не спяшаюцца з крэдытаваннем. Па ацэнцы таго ж Еўрастата, італьянскай банкаўскай сістэме для поўнага аднаўлення патрабуецца не менш як €200 млрд.

У тым, што тычыцца зоны еўра, эканамісты Deutsche Bank не надта аптымістычныя. Але, на іх думку, перспектывы для Італіі асабліва змрочныя. Краіна насамрэч становіцца палітычнай загадкай. «Італія вядомая сваёй палітычнай нестабільнасцю, але таго, што мы перажываем цяпер, яшчэ ніколі не было», — заўважае Марка Стрынга з Deutsche Bank.

### Бяда з дэмаграфіяй

Негатыўная сітуацыя ў эканоміцы асабліва адбілася на рынку працы. Узровень беспрацоўя ў Італіі не самы высокі ў зоне еўра. Тым не менш беспрацоўе сярод моладзі складае 39,2%. Такой вялікай розніцы няма ні ў адной іншай еўрапейскай краіне. «Моладзь у Італіі пакутуе больш за ўсё», — кажа Марка Стрынга. Адметна, у краіне самы высокі ў свеце паказчык колькасці моладзі, якая жыве з бацькамі. Ашаламляльныя 80,6% грамадзян Італіі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў да гэтага часу жывуць разам з бацькамі, піша Daily Mail са спасылкай на даклад Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця.

**Тэмпы росту ВУП Італіі на працягу пяці гадоў вагаліся на ўзроўні 0,3%-0,5%, у той час як узровень беспрацоўя дэманстраваў устойлівы рост — з 8% у 2012 годзе да 12,6% летась.**

Такому збегу абставін нямала паспрыяла наяўнасць у Італіі значнага знешняга доўгу. Інфляцыя ў Італіі расце, у той час як заробкі застаюцца на ранейшым узроўні. Вялікая колькасць маладых людзей застаюцца беспрацоўнымі. Паводле статыстыкі 26,9% італьянскіх падлеткаў не маюць работы, а таксама не занятыя ў сферы адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі. У ЗША і Вялікабрытаніі гэтыя паказчыкі складаюць 14,4% і 13,6% адпаведна. У той жа час у Штатах з бацькамі жывуць 66,6% маладых людзей, у Вялікабрытаніі — 52,4%. Менш за ўсё маладых людзей застаюцца жыць з бацькамі ў Канадзе. Гэты паказчык у краіне складае 30,9%. У Славеніі, Грэцыі, Славакіі, Партугаліі, Іспаніі, Венгрыі і Чэхіі больш за 70% маладых людзей усё яшчэ залежаць ад матэрыяльнай падтрымкі з боку бацькоў.

Увогуле з дэмаграфіяй у Італіі вялікая праблема. Колькасць нараджэнняў на жанчыну там ніжэй, чым у такіх дэпрэсіўных і схільных да адтоку насельніцтва краінах ЕС, як Балгарыя і Эстонія. Летась на Апенінах нарадзілася ўсяго 488 тысяч дзяцей — гэта самы нізкі паказчык у гісторыі Італіі пачынаючы з 1861 года. Тэарэтычна ў Італіі існуюць добра аплатныя дэкрэтныя водпускі. На практыцы большасць работадаўцаў прымушае жанчын падпісваць дамовы, паводле якіх яны, зацяжарыўшы, павінны напісаць заяву аб звальненні. Інакш работу часам не знайсці. Пры гэтым сярод усіх узроставых груп колькасць беспрацоўных жанчын значна перавышае колькасць беспрацоўных мужчын. Сёння большасць італьянцаў вымушана альбо шукаць работу, альбо — калі ўжо яе знайшлі — атрымліваць асалоду ад спажывання, таму што цэнавы парог такіх пажаданых жыццёвых арыенціраў, як пабудова жылля або вялікая сям'я, недасягальна высокі для большасці жыхароў краіны.

Асноўны пік нараджальнасці на Апенінах прыпаў на 1950 і 1960-я гады, калі хваля эканамічнага ўздыму прынесла ў італьянскія гарады велізарныя сем'і вясковай беднаты. Сёння іх дзеці адмаўляюцца працягваць свой род. На змену ідуць вялікія сем'і мігрантаў з Румыніі, Албаніі, а таксама надзвычай актыўна перамяшчаюцца бежанцы з краін Блізкага Усходу і Афрыкі, якія сапраўды гэтак жа штурмуюць італьянскія гарады і рады жыць у невыносных, на погляд мясцовых, умовах, абы іх дзеці замацаваліся тут. І ўрад усяляк заахвочвае нараджальнасць сярод мігрантаў, бо гэта бюджэтней, чым забяспечваць дэкрэтныя водпускі і дзіцячыя сады для мясцовых мам. З 2014 года любому дзіцяці, якое нарадзілася ў Італіі, калі ён вучыцца ў пачатковай або сярэдняй школе, будзе выдавацца італьянскі пашпарт. Нядзіўна, што, па звестках Нацыянальнага статыстычнага агенцтва Istat, на 37 працэнтаў задаволеных сваім жыццём італьянцаў прыпадае больш за 60 працэнтаў шчаслівых мігрантаў.

### «Рулетка» для Матэа Рэнцы

Эканамічны крызіс для Італіі не ў навіну. Італьянцы жывуць у такіх умовах не менш за дзесяць гадоў і ўжо, падобна, прывыклі да мноства праблем і да таго, што іх эканоміка ў лепшым выпадку топчацца на месцы і толькі зрэдку нясмела робіць маленькія крокі наперад. Прызвычаіліся жыхары Апенін і да палітычных крызісаў. Напэўна, ні ў якой іншай краіне планеты так часта не мяняліся прэм'еры і ўрады, як у Італіі ў паваенную пару. Не выключана, што цяпер насоўваецца чарговы палітычны крызіс і краіна застанецца без кабінета міністраў.

Натхніўшыся вопытам Вялікабрытаніі і яе «брэксітам», прэм'ер-міністр Італіі вырашыў правесці свой рэферэндум аб змене канстытуцыі краіны. У выпадку правалу Рэнцы можа сысці ў адстаўку, а краіна — акунуцца ў палітычны і эканамічны хаос. На пасяджэнні ўрада была нарэшце вызначана дата рэферэндуму — ён адбудзецца 4 снежня. У канстытуцыю Італіі прапануецца ўнесці значныя змены. Канстытуцыйны рэферэндум накіраваны на скарачэнне колькасці сенатараў да 100 чалавек са звыклых 315. Рэнцы плануе пераўтварыць сенат рэспублікі ў сенат рэгіёнаў, асновай для фарміравання якога будуць рэгіянальныя дарадцы і мэры. Пры гэтым сенат будзе валодаць заканадаўчай уладай толькі па пытаннях рэформаў і ўнясення змяненняў у канстытуцыю.

Пры цяперашняй сістэме верхняя і ніжняя палаты парламента краіны маюць роўныя паўнамоцтвы. Эксперты сцвярджаюць, што гэта адна з прычын, чаму Італія мела 63 урады з часоў Другой сусветнай вайны, бо ні адзін з іх не быў дастаткова моцным, каб выжыць на працягу поўнага тэрміну паўнамоцтваў у пяць гадоў. Акрамя гэтага ў выніку рэформы зменшацца паўнамоцтвы рэгіёнаў: па новых правілах пытаннямі энергетыкі, стратэгічнай інфраструктуры і грамадзянскай абароны будзе займацца прэзідэнт. Разам з гэтым палата дэпутатаў зможа зацвярджаць законы, якія рэгламентуюць пытанні, што ўваходзяць у кампетэнцыю рэгіянальных уладаў. Для прыцягнення выбаршчыкаў Рэнцы абяцае зніжэнне падаткаў і пенсійную рэформу, адзначае Bloomberg. Па словах самога прэм'ер-міністра, канстытуцыйная рэформа дапаможа зрабіць заканадаўства Італіі больш эфектыўным.

**Летась на Апенінах нарадзілася ўсяго 488 тысяч дзяцей — гэта самы нізкі паказчык у гісторыі Італіі пачынаючы з 1861 года.**

На думку аналітыкаў Deutsche Bank, найбуйнейшай палітычнай рызыкай для зоны еўра з'яўляецца зусім не палітычна спаралізаваная Іспанія ці будучыя выбары ў Францыі і Германіі, а Італія і яе рэферэндум. І яны не адзіныя, хто так ацэньвае сітуацыю. Рэйтынгавае агенцтва Fitch папярэдзіла аб магчымых наступствах запланаванага рэферэндуму: «Усе палітычныя ўзрушэнні або цяжкасці ў банках, якія распаўсюджваюцца на сектар рэальнай эканомікі, могуць аказаць негатыўны ўплыў на рэйтынг, які мы прысвоім Італіі».

Рэферэндум датычыцца ўсяго фінансавага свету. Сэнс зразумелы: час Італіі на зыходзе. Калі ў хуткім часе Рым не зможа ажыццявіць радыкальныя перамены, то адна з краін-заснавальнікаў Еўрапейскага саюза стане адной з самых вялікіх рызык для яго. На думку аналітыкаў Morgan Stanley, якія займаюцца дэталёвым вывучэннем плебісцыту, паспяхаў чакаць не варта.

Занепакоенасць аналітыкаў выклікае сцэнарый, у якім Рэнцы са сваім рэферэндумам з трэскам правальваецца. Гэта будзе выгадна апазіцыйнаму руху «Пяць зорак», чый кандыдат, дарэчы, нядаўна стала мэрам Рыма. Яны, напэўна, скарыстаюцца асечкай прэм'ера і паспрабуюць правесці наступны рэферэндум аб членстве Італіі ў ЕС. Мэр Рыма Вірджынія Раджы адкрыта заявіла, што адмоўны вынік рэферэндуму «пахавае ўрад».



«Калі Рэнцы выйграе рэферэндум, гэта будзе велізарны крок наперад, — заўважыў старшыня парламенцкага камітэта па еўрапейскіх справах Бундэстага Гюнтэр Крыхбаўм. — Але калі ён прайграе, гэта нанясе ўдар не толькі па яго кар'еры, але і па ўсёй краіне ў цэлым». Што ж, чакаць развязкі еўрапейскай інтрыгі засталося зусім нядоўга.

**Захар БУРАК.**
burak@zviazda.by

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 5»,

расположенное по адресу: 220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253, информирует о выплате дивидендов по акциям за девять месяцев 2016 года.

Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям, — 24 октября 2016 года.

Дивиденды, начисленные на одну акцию, – 0,002632 белорусского рубля (по простым (обыкновенным) акциям).

Срок выплаты дивидендов по акциям – с 24 октября 2016 года до 22 ноября 2016 года.

**Порядок выплаты дивидендов по акциям:**

физическим лицам – в безналичном порядке путем перечисления денежных средств на банковские счета акционеров (вкладные или карт-счета), открытые в ОАО «АСБ Беларусбанк». Депонирование неполученных дивидендов производить не более трех лет;

юридическим лицам – в безналичном порядке путем перечисления денежных средств со счета Общества на расчетные счета юридических лиц;

на акции, принадлежащие Республике Беларусь, в безналичном порядке путем перечисления денежных средств со счета Общества в республиканский бюджет.

УНП 100219908

## Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома

**Объявляет о проведении публичных торгов по реализации имущества, принадлежащего Демчуку Сергею Всеволодовичу, зарегистрированного за ОДО «Перспектива-Инвест Строй»**

Лот №1. Капитальное строение с инв. номером 500/С-18470, расположенное по адресу: г. Минск, пр. Независимости, д. 110, площадью 132 кв.м, назначение: здание неустановленного назначения.

**Стоимость 117 804 белорусских рубля 18 копеек.**

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://just-minsk.gov.by/**, а также в помещении отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома: г. Минск, ул. Коллекторная, 3.

**Торги состоятся 21.11.2016 года в 11.00 часов по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3, каб. 14.**
**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться к:**
**судебный исполнитель Русецкий Алексей Павлович, т/ф (017) 200-12-93, +375-33-398-13-10**
**начальник отдела Шмарловская Ирина Владимировна, т. 200-13-48 +375-33-398-13-00**
**с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 или по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900002445 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г.Минск, код 795, УНП 100223493 отдела принудительного исполнения УПИ ГУЮ Мингорисполкома не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Начальник отдела И.В. Шмарловская

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**10 ноября 2016 года на 12-м открытом аукционе проводит 11-й от 13.10.2016 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 173 | Грузовой КрАЗ-255 ш.541316 дв.1971 1985г. 4кат. 54 022 км | г.Береза в/ч 23324 | 4200,00 | 420,00 |
| 174 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш.541178 дв.952958 1986г.4кат.3 854 км | г.Береза в/ч 23324 | 6900,00 | 690,00 |
| 175 | Автошасси Урал-375А ш.341482 дв.19176 1980г. 5кат. 9 645 км | н.п.Лесная в/ч 52215 | 2800,00 | 280,00 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **10 ноября 2016 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 часов 04 ноября 2016 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **10 ноября 2016 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли—р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли—р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701,ОАО «БПС- Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369 УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090 Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС.**

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**
**Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by.**

## Открытое акционерное общество «Брест-Юбилейный»

местонахождение – г.Брест, ул.Московская, д.328, почтовый адрес: 224023 г.Брест, ул.Московская, д.328.

**Способ реорганизации** — выделение из него общества с ограниченной ответственностью.

Решение принято собранием акционеров 21.10.2016 г.

Акции не распределяются.

Депозитарий — закрытое акционерное общество «Траст-Запад», г.Брест, ул.Советская, 93,95, комн.46.

УНП 200062076

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | | |
|---|---|---|---|
| Продавец | **УП «СВ КЛАСС»,** Могилевская обл., г. Бобруйск, ул.Минская, 142-Г | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот №1** | | | |
| Здание бондарно-сушильного цеха | 1922,3 | 710/С-15670 | г. Бобруйск, ул. Рогачевская, 37Б |
| Составные части и принадлежности: пять пристроек | | | |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0.4413 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания производственного здания. | | | |
| **Начальная цена с НДС – 142 860 руб. 00 коп. (1 428 600 000 бел. руб.)** | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Здание мебельного** производства (здание неустановленного назначения) | 852,5 | 710/С-4252 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142А/15 |
| Составные части и принадлежности: пилорама | | | |
| Сведения о земельном участке: кадастровый номер 741000000001000394 (присвоен предварительно). | | | |
| **Начальная цена с НДС – 80 134 руб. 00 коп. (801 340 000 бел. руб.)** | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Здание склада химматериалов** (здание нежилое) | 1392,9 | 710/С-39960 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142Д |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0.2528 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания склада химматериалов. | | | |
| **Начальная цена с НДС – 144 480 руб. 00 коп. (1 444 800 000 бел. руб.)** | | | |
| **Лот №4** | | | |
| **Здание электроцеха** (здание нежилое) | 717 | 710/С-41163 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142Г |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0.0589 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания электроцеха. | | | |
| **Начальная цена с НДС – 105 000 руб. 00 коп. (1 050 000 000 бел. руб. )** | | | |
| **Лот №5** | | | |
| **Подсобное хозяйство** | 1223 | 710/С-4251 | г. Бобруйск, ул. Минская, 142К |
| Составные части и принадлежности: с шестью пристройками | | | |
| Сведения о земельном участке: **пл. 0.4575 га**, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. | | | |
| **Начальная цена с НДС – 89 600 руб. 00 коп. (896 000 000 бел. руб. )** | | | |
| **Обременения** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона. | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

